ЖНІВЕНЬ
3
СУБОТА
1940 год
№ 22 (478)
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

VII Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА СОВЕЦКАГА САЮЗА

Даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на пасяджэнні Вярхоўнага Совета СССР 1 жніўня 1940 года

Таварышы дэпутаты!

За мінуўшыя пасля Шостай Сесіі Вярхоўнага Совета чатыры месяцы ў Еўропе адбыліся падзеі вялікай важнасці. У рэзультаце разгарнуўшыхся ваенных дзеянняў з боку Германіі, спачатку ў Нарвегіі і Даніі, а затым у Бельгіі і Галандыі і, нарэшце, на тэрыторыі Францыі, вайна ў Еўропе набыла вялікі размах. 10 чэрвеня да Германіі далучылася Італія, аб'явіўшая вайну Англіі і Францыі. Такім чынам, чацвертая буйнейшая еўрапейская дзяржава ўступіла ў вайну.

З вясны гэтага года вайна стала разгортвацца быстрымі тэмпамі. Не спыняючыся на падзеях, якія мелі месца ў Нарвегіі, Даніі, Бельгіі і Галандыі, трэба асоба адзначыць факт быстрага паражэння і капітуляцыі Францыі. За якія-небудзь месяц-паўтара германская армія не толькі зламала супраціўленне Францыі, але і прымусіла яе падпісаць умовы перамір'я, па якіх большая частка тэрыторыі Францыі, разам з Парыжам, прадаўжае аставацца тэрыторыяй, акупіраванай германскімі войскамі. Тым не менш, атрымаўшы перамір'е, Францыя яшчэ не мае міру. Аб умовах міру наогул яшчэ нічога не вядома. З двух саюзнікаў, процістаячых Германіі і Італіі, асталася толькі Англія, якая рашыла прадаўжаць вайну, апіраючыся на дапамогу ЗША.

Тут няма неабходнасці спыняцца на ўсіх прычынах паражэння Францыі, выявіўшай сваю выключную слабасць у вайне. Ясна, што справа тут не толькі ў дрэннай ваеннай падрыхтоўцы, — хоць гэта прычына стала агульнавядомай. Не малую ролю адыграла тут таксама тая акалічнасць, што французскія кіруючыя кругі — не ў прыклад Германіі — надта лёгкамысленна адносіліся да пытання аб ролі і ўдзельнай вазе Совецкага Саюза ў справах Еўропы.

Падзеі апошніх месяцаў наглядна паказалі нешта большае. Яны паказалі, што правячыя кругі Францыі не былі звязаны з народам і не толькі не апіраліся на яго, але баяліся свайго народа, маючага заслужаную славу свабодалюбнага народа з слаўнымі рэвалюцыйнымі традыцыямі. У гэтым адна з сур'ёзных прычын ускрыўшайся слабасці Францыі.

Перад народам Францыі стаяць цяпер цяжкія задачы залечвання ран, нанесеных вайной, а затым і задачы адраджэння, якія, аднак, немагчыма ажыццявіць старымі метадамі.

Германія дабілася ў вайне супроць саюзнікаў вялікіх поспехаў, але яна яшчэ не дабілася сваёй асноўнай задачы — спынення вайны на пажаданых для яе ўмовах. 19 ліпеня рэйхсканцлер Германіі зноў звярнуўся да Англіі з заклікам дагаварыцца аб міры, але англійскі ўрад, як вядома, адверг гэту прапанову. Англійскі ўрад вытлумачыў гэту прапанову, як патрабаванне капітуляцыі Англіі і адказаў заявой, што ён будзе прадаўжаць вайну да перамогі. Ён пайшоў нават на разрыў дыпламатычных адносін з сваёй учарашняй саюзніцай — Францыяй. Гэта значыць, што ўрад Англіі не хоча паступіцца сваімі калоніямі, якія ёсць ва ўсіх частках зямнога шара, і заяўляе аб гатоўнасці весці і далей вайну за сусветнае панаванне, не глезячы на тое, што пасля паражэння Францыі і ўступлення ў вайну Італіі на старане Германіі, гэта барацьба для Англіі стала значна трудней.

Набліжаецца канец першаму году еўрапейскай вайны, але канца гэтай вайны яшчэ не відаць. Больш магчымым трэба лічыць, што ў даны момант мы стаім напярэдадні новага этапу ўзмацнення вайны паміж Германіяй, Італіяй, з аднаго боку, і Англіяй, якой дапамагаюць Злучаныя Штаты Амерыкі,—з другога боку.

Усе ўказаныя падзеі не змянілі знешняй палітыкі Совецкага Саюза. Верны палітыцы міру і нейтралітэта Совецкі Саюз не ўдзельнічае ў вайне. Нашы адносіны з Германіяй, паварот у якіх адбыўся амаль год таму назад, прадаўжаюць поўнасцю захоўвацца, як гэта абумоўлена совецка-германскім пагадненнем. Гэта пагадненне, якога строга прытрымліваецца наш ўрад, устараніла магчымасць трэнняў у совецка-германскіх адносінах пры правядзенні совецкіх мерапрыемстваў уздоўж нашай заходняй граніцы і, разам з тым, забяспечыла Германіі спакойную ўпэўненасць на ўсходзе.

Ход падзей у Еўропе не толькі не паслабіў сілы совецка-германскага пагаднення аб ненападзе, але, наадварот, падкрэсліў важнасць яго існавання і далейшага развіцця. За апошні час у замежнай і, асабліва, у англійскай і англафільствуючай прэсе нярэдка спекуліравалі на магчымасці рознагалоссяў паміж Совецкім Саюзам і Германіяй, са спробай запалохаць нас перспектывай узмацнення магутнасці Германіі. Як з нашай, так і з германскай стараны гэтыя спробы не раз выкрываліся і адкідаліся, як нягодныя. Мы можам толькі пацвердзіць, што, па нашай думцы, у аснове склаўшыхся добрасуседскіх і прыязных совецка-германскіх адносін ляжаць не выпадковыя меркаванні кан'юктурнага характару, а карэнныя дзяржаўныя інтарэсы як СССР, так і Германіі.

Трэба таксама адзначыць, што нашы адносіны з Італіяй палепшыліся за апошні перыяд. Абмен думак з Італіяй паказаў, што ў галіне знешняй палітыкі ў нашых краін ёсць поўная магчымасць забяспечыць узаемнае разуменне. Упаўне абгрунтаваны таксама разлікі на ўзмацненне гандлёвых адносін.

Што-ж датычыць совецка-англійскіх адносін, то ў іх не адбылося за апошні час якіх-небудзь істотных змен.

Трэба прызнаць, што пасля ўсіх тых варожых актаў Англіі супроць СССР, аб якіх не раз ужо прыходзілася гаварыць на Вярхоўным Совеце, цяжка было чакаць добрага развіцця совецка-англійскіх адносін, хоць назначэнне п. Крыпса паслом у СССР, магчыма, адлюстроўвае жаданне Англіі палепшыць адносіны з Совецкім Саюзам.

Цяпер дазвольце перайсці да тых пытанняў нашай знешняй палітыкі, паспяховае вырашэнне якіх у апошні час значна расшырыла нашу тэрыторыю і ўмножыла сілы Совецкага Саюза. **(Бурныя апладысменты).**

Тут няма неабходнасці падрабязна спыняцца на тым, як адбылося далучэнне да Совецкага Саюза Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. Адпаведныя дакументы поўнасцю былі апублікаваны 28 чэрвеня. У прадстаўленні, якое мною было зроблена румынскаму пасланніку ў Маскве п. Давідэску, прапаноўвалася:

1. Вярнуць Бесарабію Совецкаму Саюзу.

2. Перадаць Совецкаму Саюзу паўночную частку Букавіны.

Як вядома, урад Румыніі прыняў нашу прапанову, і канфлікт паміж Совецкім Саюзам і Румыніяй, які зацягнуўся на 22 годы, быў вырашан мірным шляхам. **(Апладысменты).** Пражываўшыя на тэрыторыі Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, галоўным чынам, украінцы і малдаване атрымалі магчымасць увайсці ў дружную сям'ю совецкіх народаў і зажыць новым жыццём, — жыццём народа, вызваленага ад улады румынскіх баяр-памешчыкаў і капіталістаў. **(Працяжныя апладысменты).** Мы ведаем цяпер, з якой вялікай радасцю насельніцтва Бесарабіі і Паўночнай Букавіны ўступіла ў рады совецкіх грамадзян.

Такім чынам, тэрыторыя Совецкага Саюза павялічылася далучэннем Бесарабіі, плошчай у 44,5 тысячы квадратных кілометраў, з насельніцтвам 3.200 тысяч чалавек, і далучэннем Паўночнай Букавіны, плошчай у 6 тысяч квадратных кілометраў, з насельніцтвам звыш 500 тысяч чалавек.

Граніцы Совецкага Саюза перасунуліся, у сувязі з гэтым, на захад і дайшлі да ракі Дуная, якая з'яўляецца, пасля Волгі, самай магутнай ракой у Еўропе і адным з важнейшых пуцей тавараабмену для раду еўрапейскіх краін.

Вы ведаеце, таварышы, што ўвесь совецкі народ з вялікай радасцю і задавальненнем сустрэў паспяховае вырашэнне доўгачаканага пытання аб Бесарабіі. З другога боку, нашы адносіны з Румыніяй цяпер павінны ўвайсці ў зусім нармальнае русла.

Пераходжу да пытання аб нашых адносінах з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй. Пытанне аб узаемаадносінах Совецкага Саюза з прыбалтыйскімі краінамі ўстала ў апошні час па-новаму, паколькі заключаныя з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй пакты аб узаемадапамозе не далі патрэбных рэзультатаў. Заключэнне гэтых пактаў не павяло, як гэтага трэба было чакаць, да збліжэння Літвы, Латвіі і Эстоніі з Совецкім Саюзам, таму што гэтаму запрацівіліся правячыя буржуазныя групы гэтых краін. Гэтыя правячыя групы не толькі не пайшлі па шляху збліжэння з Совецкім Саюзам, чаго як быццам можна было чакаць пасля заключэння пактаў узаемадапамогі, але пайшлі па шляху ўзмацнення варожых Совецкаму Саюзу дзеянняў, якія праводзіліся імі тайком і за спіной СССР. Для гэтага была выкарыстана так званая Балтыйская Антанта, у якой раней ваенным саюзам, накіраваным супроць СССР, былі звязаны толькі Латвія і Эстонія, але якая з канца мінулага го-



да ператварылася ў ваенны саюз, уключаючы апрача Латвіі і Эстоніі таксама і Літву.

З гэтага следуе, што правячыя буржуазныя групы Літвы, Латвіі і Эстоніі аказаліся няздольнымі да чэснага правядзення ў жыццё заключаных Совецкім Саюзам пактаў узаемадапамогі, што яны, наадварот, яшчэ ўзмацнілі варожую Совецкаму Саюзу дзейнасць. Колькасць фактаў, гаворачых аб тым, што ўрады гэтых краін груба парушаюць заключаныя з СССР пакты ўзаемадапамогі, усё павялічвалася. Далей цярпець такое становішча, асабліва ва ўмовах сучаснай міжнароднай абстаноўкі, станавілася зусім немагчымым. Вось чаму наследвалі вядомыя вам патрабаванні Совецкага ўрада аб змене састава ўрадаў Літвы, Латвіі, Эстоніі і аб уводзе на тэрыторыю гэтых дзяржаў дадатковых часцей Чырвонай Арміі.

Рэзультаты гэтых крокаў нашага ўрада вам вядомы.

Важнейшай мерай створаных у Эстоніі, Латвіі і Літве прыязных Совецкаму Саюзу ўрадаў было правядзенне свабодных выбараў у парламенты. У ліпені месяцы былі праведзены дэмакратычныя выбары ў літоўскі сейм, у латвійскі сейм і ў дзяржаўную думу Эстоніі. Выбары паказалі, што правячыя буржуазныя клікі Літвы, Латвіі і Эстоніі не адлюстроўвалі волю сваіх народаў, што яны былі прадстаўнікамі толькі вузкай групы эксплаататараў. Выбраныя на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага галасавання, з тайнай падачай галасоў сеймы Літвы і Латвіі, дзяржаўная дума Эстоніі ўжо выказалі сваю аднадушную думку па карэнных палітычных пытаннях. Мы з задавальненнем можам канстатаваць, што народы Эстоніі, Латвіі і Літвы дружна прагаласавалі за сваіх прадстаўнікоў, якія аднадушна выказаліся за ўвядзенне совецкага ладу і за ўступленне Літвы, Латвіі і Эстоніі ў састаў Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік. **(Бурныя апладысменты).**

Тым самым узаемаадносіны паміж Літвой, Латвіяй, Эстоніяй і Совецкім Саюзам павінны ўстаць на новую аснову.

Вярхоўны Совет будзе разглядаць пытанне аб уваходжанні ў Совецкі Саюз Літвы, Латвіі і Эстоніі ў якасці Саюзных Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Няма ніякага сумнення ў тым, што ўваходжанне гэтых рэспублік у Совецкі Саюз забяспечыць ім быстры гаспадарчы ўздым і ўсебаковы росквіт нацыянальнай культуры, што ўваходжаннем у Совецкі Саюз іх сілы будуць у многа разоў умножаны, іх бяспечнасць будзе ўмацавана і, разам з тым, яшчэ больш узрасце магутнасць вялікага Совецкага Саюза. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты).**

Уваходжанне прыбалтыйскіх краін у СССР азначае, што Совецкі Саюз павялічваецца на 2.880 тысяч насельніцтва Літвы, на 1.950 тысяч насельніцтва Латвіі і на 1.120 тысяч насельніцтва Эстоніі.

Такім чынам, разам з насельніцтвам Бесарабіі і Паўночнай Букавіны, насельніцтва Совецкага Саюза павялічыцца, прыкладна, на 10 мільёнаў чалавек. **(Апладысменты).** Калі да гэтага дадаць звыш 13 мільёнаў насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, то, выходзіць, што Совецкі Саюз павялічыўся за апошні год больш, чым на 23 мільёны насельніцтва. **(Апладысменты).**

Трэба адзначыць, што $^{19}/_{20}$ усяго гэтага насельніцтва ўваходзіла раней у састаў СССР, але было сілай адарвана ад СССР у момант яго ваеннай слабасці імперыялістычнымі дзяржавамі Захада. Цяпер гэта насельніцтва з'еднана з Совецкім Саюзам.

Як паказваюць падлікі насельніцтва, Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік зможа цяпер гаварыць магутным голасам ад імені 193 мільёнаў насельніцтва, не лічачы прыросту насельніцтва СССР за 1939 і 1940 годы. **(Працяжныя апладысменты).**

Першаступеннае значэнне для нашай краіны мае той факт, што ад гэтага часу граніцы Совецкага Саюза будуць перанесены на ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Разам з гэтым, у нашай краіны паяўляюцца свае незамярзаючыя порты ў Балтыйскім моры, у якіх у нас такая вялікая патрэба.

Поспехі знешняй палітыкі Совецкага Саюза тым больш значны, што ўсяго гэтага мы дабіліся мірным шляхам, што мірнае вырашэнне пытанняў як у прыбалтыйскіх краінах, так і ў Бесарабіі прайшло пры актыўным удзеле і падтрыманні шырокіх народных мас гэтых краін. **(Апладысменты).**

Трэба, разам з тым, сказаць, што на ўрад Совецкага Саюза ўскладаецца вялікая адказнасць за правільнае і арганізаванае правядзенне практычных мер у справе палітычнай і эканамічнай перабудовы ў новых совецкіх рэспубліках.

На мінулай Сесіі Вярхоўнага Совета мне прыходзілася дакладваць аб мірным дагаворы з Фінляндыяй. Прайшло 4 з лішнім месяцы пасля заключэння гэтага дагавора, які праводзіцца ў агульным здавальняюча. За гэты час заключан ужо і гандлёвы дагавор з Фінляндыяй, прычым, мы лічым, што гаспадарчыя адносіны паміж нашымі краінамі могуць мець спрыяючую перспектыву развіцця. Фінляндскі ўрад прыняў таксама нашу прапанову аб дэмілітарызацыі Аландскіх астравоў і аб устанаўленні на гэтых астравах Совецкага консульства. Што датычыць далейшага развіцця совецка-фінляндскіх адносін у добрым для абодвух краін кірунку, то гэта залежыць, галоўным чынам, ад самой Фінляндыі. Зразумела, што калі некаторыя элементы фінляндскіх правячых кругоў не спыняць сваіх рэпрэсіўных дзеянняў супроць грамадскіх слаёў Фінляндыі, якія імкнуцца ўмацаваць добрасуседскія адносіны з СССР, то адносіны паміж СССР і Фінляндыяй могуць пацярпець ушчэрб. **(Смех. Апладысменты).**

Нашы адносіны са скандынаўскімі краінамі — з Нарвегіяй і Швецыяй — не могуць не знаходзіцца ў залежнасці ад склаўшайся там абстаноўкі. У адносінах Нарвегіі, з прычыны яе асаблівага палажэння, зараз яшчэ нельга сказаць чаго-небудзь пэўнага. У адносінах Швецыі трэба прызнаць асабліва актуальным тое, што абедзве нашы краіны зацікаўлены ў значным развіцці гандлёва-гаспадарчых адносін. Гаспадарчыя перагаворы, якія вядуцца зараз са Швецыяй, павінны, спадзяюся, прывесці да пагаднення, маючага немалыя выгады для абодвух старон.

Што датычыць балканскіх краін, то трэба, перш за ўсё, адзначыць факт устанаўлення дыпламатычных адносін з Югаславіяй. Калі можна сказаць, што не па нашай віне да гэтага часу адсутнічалі дыпламатычныя адносіны паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй, то ўстанаўленне гэтых адносін цяпер адбылося па прапанове ўрада Югаславіі, якая была ахвотна прынята Совецкім Саюзам. Можна спадзявацца, што паступова будуць развівацца і нашы эканамічныя адносіны з Югаславіяй.

Нашы адносіны з Балгарыяй можна лічыць нармальнымі. Можна дадаць, што паміж Совецкім Саюзам і Балгарыяй няма такіх супярэчнасцей, якія перашкаджалі-б далейшаму паляпшэнню адносін.

У нашых адносінах з Турцыяй не адбылося якіх-небудзь істотных змен. Варта толькі сказаць, што апублікаваныя нядаўна ў германскай «Белай кнізе» дакументы кінулі непрыемнае святло на некаторыя стораны дзейнасці ў Турцыі. Паследаваўшыя затым раз'ясненні французскага пасла ў Турцыі Масільі не змаглі нічога змяніць у характары гэтых дакументаў. У сувязі з гэтым я павінен сказаць, што яшчэ ў пачатку красавіка месяца совецкі ўрад заявіў Турцыі аб недапушчальнасці наступнага факта. Справа заключалася ў тым, што ў пачатку красавіка з тэрыторыі Турцыі прыляцеў нейкі замежны самалёт у раён нашага горада Батумі, дзе знаходзіцца вялікая колькасць нафтаперагонных заводаў. Турэцкая старана спачатку прабавала паказаць справу так, што наогул ніякага самалёта з тэрыторыі Турцыі не пераляляла, а затым усё-ж абяцала на будучы час прыняць меры супроць такога роду пералёту. **(У зале ажыўленне, смех).** Пасля апублікаваных у Германіі дакументаў відаць, што гэта быў за самалёт. З гэтага следуе, што наша прадстаўленне турэцкаму ўраду сапраўды было поўнасцю абгрунтаваным.

Што датычыць Ірана, то ніякіх новых важных момантаў нельга адзначыць. Аднак, і пры ўпамінанні аб Іране нельга прайсці міма аднаго недапушчальнага факта. У канцы сакавіка месяца ў раёне Баку, гэтак-жа як некалькі пазней, у раёне Батумі, паявіліся два замежныя самалёты, прыляцеўшыя з боку Ірана. Іранскі ўрад знайшоў патрэбным адмаўляць гэты факт. Але і ў даным выпадку памянёныя дакументы германскай «Белай кнігі» дастаткова раз'ясняюць справу.

Трэба заўважыць, што паўтарэнне пасылкі такіх разведчых замежных самалётаў ні да чаго іншага, як да ўскладненняў нашых адносін з суседзямі не магло-б прывесці. Няпрошаныя-ж візіты ўказаных самалётаў да Баку і Батумі мы зразумелі ў тым сэнсе, што ў далейшым трэба ўзмацніць пільнасць і на гэтых паўднёвых совецкіх граніцах. **(Апладысменты).**

Адносна Японіі можна сказаць, што ў апошні час нашы адносіны пачалі некалькі нармалізіравацца. У прыватнасці, 9-га чэрвеня было дасягнута пагадненне аб удакладненні граніцы ў раёне мінулагодняга канфлікта на рацэ Халхын-Гол. Гэты факт мае тым большае значэнне, што меўшаяся доўгая затрымка ў вырашэнні гэтага пытання адмоўна адбівалася да апошняга часу на ўрэгуліраванні ўзаемаадносін паміж СССР і Японіяй, а таксама паміж Мангольскай Народнай Рэспублікай і Манчжоу-Го. У бліжэйшыя дні прыступае да работы змешаная камісія Мангольскай Народнай Рэспублікі і Манчжоу-Го для правядзення граніцы на месцы. Можна прызнаць, што наогул ёсць вядомыя прызнакі жадання японскай стараны да палепшання адносін з Совецкім Саюзам. Пры ўзаемным прызнанні інтарэсаў старон, паколькі абедзве стараны зразумеюць неабходнасць адхілення некаторых страціўшых значэнне перашкод на гэтым шляху, такое палепшанне совецка-японскіх адносін ажыццявіма. Трэба, аднак, прызнаць, што ў праграме новага японскага ўрада наконт устанаўлення «новай палітычнай структуры» яшчэ многа няяснага. Відаць, што экспансія на поўдзень, аб якой шумяць японскія газеты, усё больш прыцягвае ўвагу кіруючых кругоў Японіі, асабліва з прычыны таго, што адбыўшыяся змяненні ў Еўропе не могуць не знайсці свайго адлюстравання і ў раёнах, цікавячых гэтыя кругі Японіі. Але яшчэ ў многім няясны сапраўдныя палітычныя імкненні гэтых кругоў, што датычыць і совецка-японскіх адносін.

На нашых адносінах з Злучанымі Штатамі Амерыкі я спыняцца не буду, хоць-бы ўжо таму, што аб іх нельга сказаць нічога добрага. **(Смех).** Нам стала вядома, што сяму-таму ў Злучаных Штатах не падабаюцца поспехі совецкай знешняй палітыкі ў Прыбалтах. Але, прызнацца, нас мала цікавіць гэтая акалічнасць **(смех, апладысменты)**, паколькі з сваімі задачамі мы спраўляемся і без дапамогі гэтых нездаволеных паноў. **(Смех, апладысменты).**

Аднак, тая акалічнасць, што ў Злучаных Штатах улады незаконна затрымалі золата, нядаўна купленае нашым дзяржаўным банкам у банкаў Літвы, Латвіі і Эстоніі, выклікае з нашага боку самы энергічны пратэст. У даным выпадку мы можам толькі напомніць як ураду Злучаных Штатаў, так і ўраду Англіі, які стаў на той-жа шлях, аб іх адказнасці за гэтыя незаконныя дзеянні.

Што-ж датычыць нашых адносін з вялікім нацыянальным Кітаем, вядучым барацьбу за сваё існаванне, то яны захавалі свой добрасуседскі і прыязны характар, які выцякае з совецка-кітайскага пакта ненападу.

На гэтым дазвольце закончыць заўвагі, якія датычаць нашых адносін з асобнымі краінамі.

Мне астаецца сказаць некалькі слоў аб агульнай перспектыве развіцця міжнародных падзей.

Змены, якія адбыліся ў Еўропе ў рэзультаце вялікіх поспехаў германскай зброі, ні ў якім разе нельга прызнаць такімі, якія ўжо цяпер абяцалі-б блізкую ліквідацыю вайны. Падзеі прывялі к таму, што адна старана, асабліва Германія, значна ўзмацнілася ў рэзультаце сваіх ваенных поспехаў, другая-ж старана ўжо не прадстаўляе адзінага цэлага, прычым, калі для Англіі стварыліся новыя вялікія трудносці ў прадаўжэнні вайны, то выпаўшая з вайны Францыя перажывае цяжкі крызіс пасля паражэння. Узмацненне адной ваюючай стараны і аслабленне другой ваюючай стараны знаходзяць сур'ёзныя адбіткі не толькі ў Еўропе, але і ў іншых частках свету. У ліку пацярпеўшых паражэнне ёсць, апрача Францыі, Бельгія і Галандыя з вялікімі каланіяльнымі ўладаннямі, якія яны не могуць цяпер абараніць з ранейшай сілай. У рэзультаце гэтага пытанне аб перадзеле калоній набывае ўсё большую вастрыню. Імперыялістычныя апетыты растуць не толькі ў далёкай Японіі, але і ў Злучаных Штатах Амерыкі, у якой нямала ахвотнікаў прыкрываць свае імперыялістычныя планы рэкламным «клопатам» аб інтарэсах усяго «Заходняга паўшар'я», якое гэтыя паны гатовы зрабіць сваёй уласнасцю з усімі яго шматлікімі рэспублікамі і каланіяльнымі ўладаннямі іншых краін на прылягаючых да амерыканскага мацерыка астравах. Усё гэта нясе небяспеку далейшага расшырэння і далейшага распальвання вайны, з ператварэннем яе ў сусветную імперыялістычную вайну.

У гэтых умовах Совецкі Саюз павінен прававіць узмоцненую пільнасць да справы сваёй знешняй безапаснасці, да ўмацавання ўсіх сваіх унутраных і знешніх пазіцый. Мы правялі пераход з 7-гадзіннага на 8-гадзінны рабочы дзень і іншыя мерапрыемствы, лічачыся з тым, што мы абавязаны забяспечыць далейшы і яшчэ больш магутны ўздым абароннай і гаспадарчай магутнасці краіны, забяспечыць сур'ёзнае ўмацаванне дысцыпліны сярод усіх працоўных, узмоцнена працаваць над падняццем прадукцыйнасці працы ў нашай краіне. Мы маем немалыя новыя поспехі, але мы не збіраемся супакоіцца на дасягнутым. Каб забяспечыць патрэбныя нам далейшыя поспехі Совецкага Саюза, мы павінны заўсёды памятаць словы таварыша Сталіна аб тым, што «трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі застаць нас зняпацку». **(Працяжныя апладысменты).** Калі ўсе мы будзем памятаць аб гэтым святым нашым абавязку, то ніякія падзеі нас не застануць зняпацку і мы даб'емся новых і яшчэ больш слаўных поспехаў Совецкага Саюза. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя авацыі. Усе ўстаюць).**

Аб чарговым пленуме ЦК ВКП(б)

Гэтымі днямі адбыўся чарговы пленум ЦК ВКП(б).

Пленум заслухаў паведамленне аб знешняй палітыцы ўрада і адобрыў яго.

Пленум абмеркаваў пытанні:

а) аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў і прыняў адпаведнае рашэнне,

б) аб кантролі над правядзеннем у жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года „Аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў“ і прыняў адпаведную пастанову.

Пленум адобрыў прапанову Соўнаркома СССР аб утварэнні Наркамата Дзяржаўнага Кантролю.

РАСЦЕ СОВЕЦКАЯ СЯМ'Я НАРОДАЎ

Здзейсніліся мары народаў Прыбалтыкі. Літва, Латвія, Эстонія—совецкія рэспублікі! Народныя парламенты прыбалтыйскіх рэспублік апраўдалі давер'е і спадзяванні сваіх народаў, прынялі гістарычныя рашэнні аб устанаўленні совецкай улады, аб уваходжанні ў састаў СССР.

Народы Літвы, Латвіі, Эстоніі разарвалі ланцугі капіталізма, змялі ўладу прадажных халопаў англа-французскага імперыялізма, рыхтаваўшых на прыбалтыйскай зямлі плацдарм для нападу на СССР.

Адышоў у змрок гісторыі, назаўсёды закрэслены воляй мужных і свабодалюбівых народаў Літвы, Латвіі, Эстоніі, час хлуслівай буржуазнай «дэмакратыі», час эксплаатацыі працоўных, беспрацоўя, жабрацтва, нацыянальнага прыгнёту.

Сонца Сталінскай Канстытуцыі ўзышло над вольнай Прыбалтыкай. Яго агністыя жыццетворчыя прамені цудоўна ператвараюць зямлю маладых совецкіх рэспублік.

Народ—гаспадар свайго лёсу—узяў у свае гаспадарскія рукі і багацці, па праву належачыя яму,—зямлю, фабрыкі, банкі.

Пачынаецца новая эпоха гісторыі народаў Прыбалтыкі—эпоха социялістычнага пераўтварэння сваёй зямлі і свайго жыцця, эпоха пабеданоснага руху ў шчаслівай сям'і совецкіх рэспублік па шляху камунізма.

З брацкай дапамогай усяго совецкага народа маладыя прыбалтыйскія рэспублікі здолеюць у самы хуткі час пазбавіцца рэштак капіталістычнага мінулага, будуць натхнёна ствараць соцыялістычную гаспадарку і соцыялістычную культуру.

Культуру прыбалтыйскіх народаў скоўвалі, душылі чорныя сілы сметонаўскіх і іншых рэакцыйных банд. Лепшыя прадстаўнікі мастацкай інтэлігенцыі, кроўна звязаныя сваёй творчасцю з народам, падвяргаліся ганенням, рэпрэсіям.

Народы Прыбалтыкі аказалі высокае давер'е сваёй інтэлігенцыі, паслаўшы лепшых прадстаўнікоў у народныя парламенты для вырашэння гістарычных спраў свайго лёсу, свайго вызвалення. І выдатны пісьменнік літоўскага народа Петрас Цвірка, пісьменніца Стасе Вайнейкене, артыстка оперы Александра Сташкевічутэ, дзесяткі майстроў літаратуры, мастацтваў—дэпутаты народных сеймаў Літвы і Латвіі, Дзяржаўнай думы Эстоніі—дастойна выразілі волю народа.

Устанаўленне совецкай улады ў прыбалтыйскіх рэспубліках адкрывае цудоўныя перспектывы магутнага ўздыму і развіцця культуры — літаратуры, ўсіх галін мастацтваў.

Перад пісьменнікамі Прыбалтыкі — шлях радаснай працы, натхнёнай творчасці на карысць і ва славу свайго народа, сваёй вольнай і шчаслівай радзімы.

Літаратура Прыбалтыкі вырасла і загартавалася ў барацьбе з рускім царызмам, польскімі панамі, стаўленікамі англійскага капітала. Гэта літаратура — тварэнні таленавітых сыноў мужных народаў Латвіі, Літвы, Эстоніі. Яна была вострай зброяй прыбалтыйскіх народаў у барацьбе з прыгнятальнікамі, у барацьбе за волю і шчасце. Да ліку літаратараў, творы якіх ярка адлюстроўваюць настроі, думкі, спадзяванні народа, адносяцца і Петрас Цвірка, Эдуард Вільдэ, Ян Райніс, з узорамі творчасці якіх мы знаёмім сёння чытача.

Брацкае еднанне культур дружнай сям'і совецкіх рэспублік узбагаціць літаратуру Прыбалтыкі новымі выдатнымі якасцямі, дасць ёй цудоўную сілу, адкрые шырокі прастор няспыннага творчага ўздыму. Сонца Сталінскай Канстытуцыі ўзгадуе новыя таленты з глыбіні народных мас. Будзе расці і квітнець новы слаўны атрад совецкай літаратуры—літаратура Совецкай Прыбалтыкі.

Совецкі народ з найвялікшай радасцю сустрэў гістарычныя рашэнні народных парламентаў Літвы, Латвіі, Эстоніі. Ён горача вітаў са слаўнай перамогай працоўных трох новых совецкіх рэспублік. Ён выказаў аднадушнае жаданне: прыняць рэспублікі Совецкай Прыбалтыкі ў сям'ю Совецкага Саюза.

Новыя перамогі краіны соцыялізма, услаўляючыя мудрасць палітыкі совецкага ўрада, геній вялікага Сталіна, уваходзяць залатымі старонкамі ў гісторыю чалавецтва.

Яшчэ адно адчувальнае паражэнне атрымаў капіталістычны свет. І яшчэ магутнейшай стала вялікая краіна соцыялізма. Горда рэюць чырвоныя сцягі над зямлёй, стаўшай навекі вольнай,—шчаслівай зямлёй Совецкай Прыбалтыкі.

1 жніўня адкрылася VII сесія Вярхоўнага Совета СССР. На сесію прыбылі дэлегацыі народных парламентаў Літвы, Латвіі, Эстоніі. Яны прывезлі ў Маскву, сталіцу СССР, пачэснае даручэнне сваіх народаў—хадайніцтва аб уключэнні совецкіх прыбалтыйскіх рэспублік у састаў СССР. Яны прывезлі ў Маскву пачуцці гарачай любві вызваленых прыбалтыйскіх народаў да правадыра, настаўніка і друга працоўных усяго свету—вялікага Сталіна.

Расце, шырыцца, мацнее сталінская сям'я совецкіх народаў!

Няхай жывуць вольныя і шчаслівыя народы Совецкай Літвы, Совецкай Латвіі, Совецкай Эстоніі!

Няхай жыве сталінская дружба народаў!

ПІСЬМЕННІКІ ПРЫБАЛТЫКІ

Ніжэй мы друкуем творы пісьменнікаў Літвы, Латвіі і Эстоніі — апавяданне літоўскага пісьменніка Петраса Цвірка «Граніца», апавяданне эстонскага раманіста і драматурга Эдуарда Вільдэ «Атэстаты старога Карла» і вершы славутага латышскага паэта Райніса.

Літоўская літаратура вырасла і ўмацавалася ў барацьбе літоўскага народа супроць яго прыгнятальнікаў — польскіх паноў і рускага царызма.

Яшчэ ў канцы восемнаццатага і ў пачатку дзевятнаццатага стагоддзя адны з першых літоўскіх паэтаў Старздас і Пошка — далі ў сваіх творах карціну пакут прыгоннага літоўскага сялянства.

Уздым нацыянальнага руху, накіраванага супроць забароны царскім урадам літоўскага друку пасля паўстання 1863 года, аказаў спрыяючы ўплыў на літоўскую літаратуру. У канцы дзевятнаццатага стагоддзя паяўляюцца сатырычныя аповесці Кудзіркі, патрыятычныя вершы Вайнайціса і іншых.

Пасля рэволюцыі 1905 года вылучыўся таленавіты пролетарскі паэт Яноніс, паэт-рамантык Майроніс.

З сучасных літоўскіх пісьменнікаў трэба асобна адзначыць аднаго са старэйшых дзеячоў літаратуры — Крэве-Міцкевічюса. Рэалістычная накіраванасць творчасці Крэве-Міцкевічюса была ўспрынята і радам маладых пісьменнікаў (Антанасам Венцлова, Людасам Гіра), у прыватнасці—Петрасам Цвіркай.

У сярэдзіне XIX стагоддзя пачаўся бурны ўздым нацыянальнай эстонскай літаратуры. Эстонскія паэты—рамантыкі гэтага перыяда — Крэйцвальд, Койдула, Гамм, а таксама празаікі Пярн, Якабсон, Кундзер і іншыя, — збіралі ўзоры народнай творчасці і ўсхвалялі далёкае мінулае сваёй краіны, калі яна яшчэ не ведала чужаземных заваёўцаў.

У канцы XIX стагоддзя ў эстонскай літаратуры зараджаецца рэалістычны напрамак, віднымі прадстаўнікамі якога былі раманіст і драматург Эдуард Вільдэ і Эрнст Петэрсон. Гэтыя пісьменнікі далі яркія карціны не толькі мінулага Эстоніі, але і сучаснай ім эпохі .

Латышская літаратура, таксама як і эстонская, развілася толькі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. У канцы гэтага стагоддзя пануючай плыняй у латышскай літаратуры становіцца рэалізм. Першымі прадстаўнікамі яго былі таленавіты паэт Бэндэнбаум і празаікі — Доку, Блауманіс і іншыя.

Рэволюцыя 1905 года вырасціла буйнейшага прадстаўніка латышскай літаратуры — паэта і драматурга Яна Райніса, які памёр у 1929 годзе. Яго вершы славяць рэволюцыйную буру, бічуюць здраднікаў і рэнегатаў, клічуць да барацьбы і перамогі. Райніс быў паэтам роднай прыроды, для паказу якой ён знайшоў незвычайна яркія і ў той-жа час пяшчотныя фарбы.

Райніс аказаў вялікі ўплыў на ўсё наступнае развіццё латышскай літаратуры.

У агульным хоры літаратур народаў СССР, пад сонцам сталінскіх клопатаў, літаратуры вызваленых народаў Прыбалтыкі расквітнеюць новым радасным цветам.

Петрас ЦВІРКА

ГРАНІЦА

Гэта апавяданне, якое чуў я ад пагранічніка, разбурыла маё ўяўленне аб граніцах. Аб граніцах, якімі аддзелена дзяржава ад дзяржавы, народ ад народа, дом ад дома, сям'я ад сям'і, чалавек ад чалавека.

Неяк аднаго разу, у асеннюю ноч, стаяў я на польскай граніцы на сваім звычайным пасту, на ўзгорку. Ужо другі дзень ішоў дробны, надаедлівы дождж. На нашай заставе рэдка здаралася, каб у нашы рукі папаўся бяглец альбо кантрабандыст. Месца было адкрытае, ні дрэваў, ні кустоў, граніца ішла сярэдзінай возера. Вакол відаць было далёка. З боку Польшчы граніца ахоўвалася патрулём, які рэдка выходзіў на бераг возера. Рабіць не было чаго,—хіба толькі думаць аб тым, што не раз ужо было перадумана, і чакаць змены.

Я звычайна так праводзіў час. Па адлегласці ста метраў ад старожкі тырчэў велізарны дубовы пень. Да гэтага пня і назад я шагаў шырокім метравым крокам і стараўся штодзённа праходзіць пятнаццаць кілометраў. Зрабіўшы два кілометры, я заходзіў у старожку выкурыць папяросу і крыху перадыхнуць.

У тую ноч, нягледзячы на дакучлівы дождж, я пачаў быў рабіць свой звычайны шлях, але не дайшоўшы да пня, заўважыў, як за ім штосьці зашапацела.

—Стой! Рукі ўгору!—выкрыкнуў я і ўскінуў вінтоўку.

Я не губляў спакойнасці, хоць невядомы, карыстаючыся добрым прыкрыццём, мог пакласці мяне на месцы.

З-за пня вырасла высокая фігура. Чалавек не спрабаваў ні супраціўляцца, ні бегчы; пад пахай ён трымаў нейкі прадмет, але, калі я другі раз скамандаваў «рукі ўгору», гэты прадмет без шуму ўпаў на зямлю. Я загадаў чалавеку адыйсці ў бок і падняў той прадмет. Гэта быў невялікі вузялок. Я падумаў, што маю справу з адным з тых малэйчыкаў, якія зрэдку наведвалі хлявы на другім баку, каб чым-небудзь пажывіцца. Невядомы прагаварыў:

— Фарштэй ніт! — Не разумею.

Асвятліўшы яго кішэнным ліхтарам, я ўбачыў прадаўгаваты, абросшы рыжай барадой твар, на якім блішчэлі спалохныя вочы. Лёгкая вопратка прамокла наскрозь, да чаравікаў прыліпла гразь. Гэта быў стары. Ён увесь дрыжаў.

Я прывёў парушальніка да старожкі і агледзіў яго. Апрача некалькіх паперак, у кішэнях у яго не было нічога. У старожцы ў двух памяшчацца было цяжка, ды суседства з падазроным суб'ектам не радавала мяне, і я пакінуў яго па дварэ. Я пазіраў за сваім палонным праз адчыненыя дзверы, не выпускаючы з рук вінтоўкі. Дождж узмацніўся і парушальнік у знямозе сеў проста на мокрую зямлю. Ён прамармытаў некалькі слоў па-яўрэйску, як-бы просячы прабачэння. Так прасядзеў ён каля трох гадзін, ляскаючы зубамі і прыкрываючы поламі прамякшага пінжака непакрытую галаву.

Раніцою, дачакаўшыся змены, я павёў палоннага ў вёску да раённага начальніка.

Наш начальнік, тоўсты, дрыжэмісты мужчына, быў вясёлым і энергічным чалавекам, вялікім аматарам анекдотаў.

Пачаўся допыт. У такіх выпадках наш начальнік не пагражаў ні зброяй, ні кулакамі, а насмешліва пытаўся:

— Ваша біяграфія, пане? Дырыжорам якога аркестра будзеце? Музыкальная адукацыя?

І да гэтага парушальніка начальнік звярнуўся з тымі-ж пытаннямі, назваўшы яго чамусьці куплетыстам.

Начальнік прагледзеў усе паперкі і сказаў:

— Біттэ пашпарт!

Затрыманы кінуў позірк на мяне, уздыхнуў і рукамі зрабіў жэст спачування.

— На гастролях? Невядомы куплетыст!—сказаў начальнік і крыва ўсміхнуўся.

Вочы палоннага раптам заблішчалі. Ён загаварыў.

Спачатку стрымана, потым ўсё мацней жэстыкуліруючы. Ён—часаўшчык. Але знайсці работу стала амаль немагчыма; голад, лютыя прыцясненні, нарэшце, зрабілі жыццё невыносным. Захапіўшы сваю маёмасць,—15 залатых гадзіннікаў, —ён паспрабаваў перайсці граніцу. Затрымалі. Пяць месяцаў ён прасядзеў у турме, потым яго выпусцілі, але не вярнулі ні рэчаў, ні дакументаў. Спрабаваў бегчы другі раз. Прайшоў праз горы, кормячыся гноем. Апрача рук, якія могуць зарабіць на жыццё, ён нічога не мае. Ён ні ў каго не адбярэ куска хлеба і нічога не хоча,—толькі маленькае месца ў чужым краю.

Пакуль часаўшчык гаварыў, начальнік штосьці пісаў і час-ад-часу кранаў ручкай гумовага слоніка, які быў знойдзен у вузялку затрыманага. Потым стукнуўшы па слоніку мацней, начальнік спытаўся:

— Навошта вам гэта?

Яурэй, сарамліва паглядзеўшы на начальніка, раптоўна прыклаў высахшую, валасатую руку да грудзей і растлумачыў, што гэта—адзіная памятка ад унучкі, якая засталася там... за граніцай.

—Гора чалавеку! Гора чэснаму і справядліваму!—уздыхнуўшы, дадаў ён. — Хіба сыны і дачкі Ізраіля—не людзі?

— А-а філосаф!—абарваўшы яго словы, прагаварыў начальнік. Затым ён звярнуўся да мяне:

—Вазьмі яго і замкні! Няхай да вечара пагаладае, а потым паслухаем далейшы рэпертуар.

Калі я, замкнуўшы затрыманага ў камеры, вярнуўся, начальнік хадзіў па пакоі.

— Усё-такі, мне штосьці не па сабе... Начальнік, моршчачыся, матнуў галавой.

— Ашуканец альбо брадзяга?—сказаў ён і, спыніўшыся, паглядзеў на мяне.— Ведаеш што? Добрая думка. У мяне ёсць стары, сапсаваны гадзіннік, няхай наладзіць! Убачым, якіх ён гадзіннікавых спраў майстар!

У той-жа вечар я даведаўся, што наш вязень амаль без інструментаў наладзіў гадзіннік.

Яны ішлі і, магчыма, яшчэ і сёння ідуць. Бегляца накармілі і пасля новага допыту, на якім ён паўтарыў тое-ж, што і на першым, яго ўначы перакінулі назад праз граніцу.

— Няхай ідзе туды, адкуль прышоў,— рашыў начальнік.—Даволі ў нас і сваіх беспрацоўных. Калі суседзям ён не патрэбен, дык мы тым больш абыйдземся без чужых часаўшчыкоў. Нарэшце, чорт ведае, хто ён такі.

Але якое-ж было наша здзіўленне, калі наступнага дня другія пагранічнікі зноў затрымалі яго на нашым баку. Яго прывялі ў вёску. Начальнік прывітаў яго:

— О, стары прыяцель! Ага, падабаўся наш хлеб? Што мне цяпер з табой рабіць? У турму? У нашых турмах і так спецыялістаў даволі.

Часаўшчык нічога не адказаў. Яго вочы, цмяныя, роўнадушныя, здавалася, нічога не бачылі. Тоўстыя, выступаючыя з ускудлачанай барады губы шавалiліся. Вопратка яго зноў была мокрая, і ён хутаўся ў яе, неяк дзіўна ўстрахваючы, быццам у яго свярбела спіна.

Бегляца пратрымалі да змроку і, пагнаўшы за сем кіламетраў, зноў перакінулі праз граніцу. Наступнай ноччу яго зноў злавілі на нашым баку.

Пачалося своеасаблівае спаборніцтва. Польскія пагранічнікі, нібы змовіўшыся, дражнілі нас, але мы не здаваліся. Для чалавека без дакументаў граніца стала зачараваным колам, з якога ён ніяк не мог вырвацца.

Увесь тыдзень пагранічнікі на працягу некалькіх кілометраў, здавалася, нічым не займаліся, як толькі лавілі і перакідвалі праз граніцу нікому непатрэбнага чалавека!!!

Калі часаўшчыка перакінулі ў шосты раз, ён ледзьве плёўся. Яго ногі ацяжэлі, вочы блішчэлі сумна і жудасна, як у вар'ята, а шчокі, якія да гэтага часу былі бледныя, сталі чырвонымі, як у хворага. Ён прыкметна пастарэў і, мне здавалася, валасы яго яшчэ больш пасівелі. Ён увесь час мармытаў адно і тое самае:

— Я чэсны чалавек, ні ў каго не адбяру куска хлеба...

У сёмы раз рашылі перакінуць яго ў тым-жа месцы, дзе затрымалі першы раз. Чакалі, калі сцямнее. Часаўшчык спаў недалёка ад пагранічнага паста, на голай зямлі. Начальнік сам прышоў праводзіць яго.

Памятаю, як сёння, я стаяў побач з ім. Да берага было некалькі дзесяткаў метраў, а там да самай вады спускаўся круты гліністы адхіл. Па небе паўзлі густыя, нізкія хмары. Я пабудзіў часаўшчыка, і начальнік загадаў яму ісці. Заспаны, бездапаможны, ён ішоў, ледзьве валочачы ногі, нібы тонучы ў гразі. Відаць, стары згубіў усякую надзею, што гэты трагічны фарс калі-небудзь скончыцца.

Мы з начальнікам паволі ішлі ззаду. Не памятаю, што гаварыў начальнік, але памятаю, як я сказаў:

— Бывае і горш...

Відаць, гэтыя словы абудзілі ў начальніка нейкі ўспамін і ён, усміхнуўшыся, пачаў расказваць анекдот. Нечаканы стрэл заглушыў яго смех. Калі рэха патанула дзесьці ў цемры, я ўбачыў, як часаўшчык, які ішоў уздоўж крутога берага, выцягнуўся на ўвесь рост, ускінуў рукі і ўпаў. Калі мы падбеглі да берага, чалавек яшчэ каціўся ўніз па адхілу, доўгі і чорны .

Ян РАЙНІС

ХВОІ

Навала рад высокіх хвой зламала,
Што бераг берaглі ад морскіх хваль.
Глядзелі горда хвоі ў неба даль.
Схіляцца ім пакоры неставала.

«Ты долу нас эгняла, ліхая сіла!
Ды мы адпомсцім свой пакутны жаль.
Імкненне наша к волі скрышыць сталь,
Нянавісць у кожнай галіне спачыла».

І хвоі выплылі на мора зноў
Свабодным статкам гордых караблёў.
Іх грудзі рэжуць штормавыя воды.

І зноў з навалай страшны бой узрос:
«Бушуй-жа, ашалелы грозны Лёс,
А мы праб'емся пад сцягі свабоды!».

НОВАЯ СІЛА

Знявечыць гэта цела — ў вашай сіле,
Мой стан сагнуць і косці сакрушыць,
Прамень агня нядрэмны патушыць
І па суду выцягваць з мяне жылы.

І дух — улада ваша катаваць,
Пакуль застогне ён ад мук суровых,
Пакутнікам каб боль свой перадаць...

Ды ён — не ваш. І ўзяты ў аковы,
Свабодны, ён паўстане з сонцам новым!

Пераклаў **А. Астрэйка.**

Эдуард ВІЛЬДЭ

АТЭСТАЦЫІ СТАРАСТЫ КАРЛА

Калі пажылому мызнаму старасту Карлу адмовілі ў службе на ранейшым месцы, ён сказаў старой:

— Чаму мне не атрымаць новае месца. Атрымліваў раней, атрымаю і цяпер. У мяне-ж добрыя атэстацыі.

— Можа быць, і другія цябе за старога палічуць, як наш,—сказала старая.

— Адзін паліча, другі не паліча. Ужо я атрымаю месца. У мяне вельмі добрыя атэстацыі.

І калі ён сустракаўся з людзьмі, ён расказваў ім, што шукае новае месца і што ў яго добрыя атэстацыі. Калі з кім-небудзь яму даводзілася весці больш доўгую гутарку, ён паказваў і атэстацыі. Ён выграбаў з кішэні, што за пазухай, старую пашарпаную кішэнную кніжку перавязаную паверх раменьчыка яшчэ вяровачкай. З кішэннай кніжкі ён вымаў тры паперкі—дзве старыя і пажаўцелыя, трэцюю—новую і белую.

На першым лісце Пяраверскі барон сведчыў, што Карл Райсмік служыў у яго ў якасці старасты дванаццаць год ва ўсіх адносінах акуратна і чэсна. На другім лісточку ўласнік мызы Кобрасце сведчыў, што староста Карл Райсмік дванаццаць год быў яму слугой верным, старанным і цвярозым. Трэцяя атэстацыя была карацейшая, але не горшая. Граф з Лійганды, які не ахвотнік быў да пісьма, паведамляў толькі, што ён дзевяць год поўнасцю быў задаволен службаю Карла Райсміка.

Калі-ж стары Райсмік паказаў свае атэстаты памешчыку, якому патрэбен быў стараста, дык памешчык сказаў:

— У цябе вельмі добрыя атэстаты, але мне патрэбен больш малады.

І другі памешчык заявіў:

— Так, ты вельмі доўга быў верным слугой памешчыка, але мне патрэбен больш малады.

І трэці, які так уважліва на яго паглядзеў, падняў ад атэстатаў вочы і запытаўся:

— Колькі-ж табе год, па-праўдзе?

Калі ён пачуў, што старому Райсміку да дня благавешчання споўніцца 70 год, дык паспешна склаў паперы і сказаў:

— Не, мне патрэбен больш малады!

Так застаўся Карл на гэты год без месца.

Год ён пражыў, зберажонага правіянту ставала, мелася і зберажоных грошай. Калі надышоў час, Карл зноў пайшоў шукаць месца службы.

І таму, што ён не быў малады, дык мусіць застацца яшчэ на год без прывычнай работы. Накоплены правіянт даўно ўжо выйшаў, але зберажоных грошай яшчэ хапала. І так як ён рабіўся не маладзейшым, а старэйшым, дык у наступны год ён шукаў ужо не столькі месца мызнага старасты, колькі «якой-небудзь іншай, больш лёгкай работы».

Але памешчыкі ўсюды адмаўлялі яму, а адзін сказаў:

— Не шукай больш службы, цяпер час табе на спакой.

— А хто-ж мяне будзе карміць?

— Хіба ў цябе няма кармільца?

— Няма. Старэйшы сын быў кучарам, жарабец яго забіў, малодшы сын быў у маёнтку прыказчыкам і памёр ад сухотаў.

— Ах, так, тады воласць павінна цябе карміць!

Гэта думка была агідна старому Райсміку. І ён стаў з яшчэ большай старанасцю шукаць сабе месца. Усёроўна, якое месца, толькі-б знайсці заработак раней, чым выйдзе апошняя капейка, толькі-б знікла думка зрабіцца жабраком, стаць са старухай валаснымі жабракамі.

Ён не быў ужо так упэўнены, што атрымае месца, ён ужо не паказваў так ахвотна сваіх атэстатаў. Але вера ўсё-такі яшчэ не знікала.

У хуткім часе да Карла дайшлі чуткі, што ў адной мызе адмовілі служачым. Каму імянна адмовілі, дакладна не ведалі, але многім. Карл узяў з шафы свае атэстаты і пайшоў. Прайшоў ён 25 вёрст запар, хоць дарогу занесла сыпучым снегам. Дарогаю ён усё маліў бога, каб удалося атрымаць месца. Жонка дома рабіла тое-ж самае.

Але гасподзь быў, мусіць, заняты больш важнымі справамі, бо старому і на гэты раз не было шчасця. Уласніку Тахула патрэбен быў начны вартаўнік, але ён сказаў Карлу:

— Цяпер нядобрыя часы, просты народ разбэсціўся, я не адважваюся пакідаць свой маёнтак нанач пад наглядам такога старыка.

Няма чаго рабіць, паплёўся ён па старой дарозе назад. Выціраў, ідучы па лясной дарозе, слёзы рукавіцай. Нічога не зробіш—бракуюць старых. Не звяртаюць нават увагі на атэстаты.

Карл думаў ісці, пакуль светла, а потым пашукаць начлегу. Але сёння сцямнела рана, бо ўзнялася мяцеліца, і за тры крокі нічога не было відаць. «Вось табе раз!—думаў стары Райсмік,—згублю такім чынам, нарэшце, дарогу і заблуджуся!»

Думаючы аб гэтым, ён сапраўды збіўся з дарогі і заблудзіўся.

Змагаўся ён яшчэ з бурай, са снегам, са стомай, і, калі знямог, кінуўся на снег і сказаў: «Мяцеліца, панясі паклон маёй старой, я тут заначую».

Мяцеліца-ж бушавала дзень і ноч, потым надышла адліга, а за адлігай моцны мароз, і, калі снег зацвярдзеў, барон з Тахула разам з некаторымі суседзямі паехаў на паляванне за зайцамі. Сонца ярка ззяла, снег блішчэў, дрэвы былі ўпрыгожаны шклянымі галінамі.

Раптам гончыя спыніліся на адным месцы—адны забрахалі, другія завылі. Звалі іх, свісталі, але яны не слухаліся. Калі паны прыбылі, яны знайшлі пад сасною барадатага старыка па пояс у снезе.

Ён ляжаў на спіне і глядзеў расплюшчанымі вачыма на сонца. Левая рука была крыху прыўзнята, а правая трымалася за пазуху, дзе хаваліся атэстаты.

Пераклаў **Р. Казак.**

ІВАН ФРАНКО

Раскрываеце кнігу пра Франко, напісаную пісьменнікам Міхайлам Кацюбінскім і чытаеце: «Невялікі, хаця дужы мужчына, высокі лоб, шэрыя, крыху халодныя вочы, у лініях падбародка штосьці энергічнае, упартае... Скромна апрануты,—ён ціхі і непрыкметны, пакуль маўчыць. А загаворыць,—і вас здзівіць, як гэтая невысокая фігура вырастае перад вамі, як у казцы. Вам стане цёпла і ясна ад святла яго вачэй, а яго мова здаецца не словам, а сталлю, што б'е аб крэмень і сыпле іскры. Моцная, упартая натура, якая вышла цэлаю з жыцейскага бою».

Такі мужны партрэт Івана Франко. І мастацкае слова яго рознастайнай творчасці было «сталлю, што б'е аб крэмень і сыпле іскры».

Уся творчасць Івана Франко прасякнута вялікай, гарачай любоўю да зняволенага народа, упэўненасцю, што праз барацьбу працоўныя здабудуць лепшую долю.

Бацькаўшчына пісьменніка, Заходняя Украіна, захлыналася ў поце і крыві працоўных пад трайным—соцыяльным, нацыянальным і рэлігійным — гнётам польскай шляхты, на якую абапіралася тады аўстрыйская манархія. І пісьменнік узняў свой моцны голас на абарону народа.

Літаратурная дзейнасць Івана Франко была надзвычай шырокая. Ён пісаў вершы, апавяданні і аповесці, раманы, казкі, сатырычныя творы, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы з гісторыі, эканомікі, літаратуразнаўства.

Лепшыя творы Івана Франко, якія сталі агульнавядомымі, такія: вершы—«Вечны рэволюцыянер», «Турэмныя санеты», «На судзе», «Таварышам з турмы»; зборнік апавяданняў—«У поце твару»; аповесці—«Боа-канстрыктар», «Барыслаў смяецца», «Захар Беркут»; «Барыслаўскія апавяданні»—«На рабоце», «Рыпнік», «Яць Заліпуга» ды іншыя; турэмныя апавяданні—«На судзе», «На світанні», паэмы—«Майсей» ды іншыя; творы для дзяцей—«Ліс Мікіта».

Іван Франко багата зрабіў у справе перакладання рускай і сусветнай літаратуры.

Пісьменнік адлюстроўваў у сваіх творах невыказныя жахі чалавечага існавання ў вёсках Заходняй Украіны. Ён паказаў крывадушную панскую канстытуцыю і так-званае скасаванне прыгону, якое адбылося ў 1848 годзе на Заходняй Украіне. У апавяданні «Лясы і пасбішча» Франко апавядае, як пан, абапіраючыся на чыноўнікаў, адвакатаў, абдурвае сялян, як ён знаходзіць новыя спосабы эксплаатацыі сялян: памешчык забраў сабе лясы і пасбішча навакол вёскі і сяляне трапілі ў яшчэ большую кабалу, чым у часе прыгону.

« — Хоць круць-верць, хоць верць-круць,—гавораць сяляне,—а за панскай уладай ліха не пазбавішся».

Абрабаваны, знямоганы селянін упякаў у горад, шукаючы паратунку ў заработках. Асабліва багата ішло сялян на нафтавыя промыслы Драгабыча і Барыслава. Але тут яны траплялі зноў у кіпцюры капіталіста, які ў сваю чаргу высмоктваў астатнія сілы з працаўніка, і тады беспараднага, знясіленага выкідваў вон.

Дзе-ж паратунак? Куды ісці? Вярнуцца зноў на панскія палі ці аб'ядноўвацца і весці барацьбу?

У вырашэнні гэтых пытанняў мастацкімі вобразамі Франко паказаў сябе як пісьменнік-змагар, які заклікае працоўных да аб'яднання і барацьбы за свае правы.

З вялікай рэалістычнай сілай рысуе пісьменнік у сваіх вялікіх творах «Боа-канстрыктар», «Барыслаў смяецца» драпежніцтва капіталістаў на нафтавых промыслах, нечалавечую эксплаатацыю рабочых і, нарэшце, паўстанні рабочых, якія дамагаюцца лепшага жыцця.

Пісьменнік пранік у самую сутнасць капіталізма і раскрыў усю гніласць і несправядлівасць гэтага спосаба вытворчасці. Капіталізм не вечны, бо ў самім зародку нясе ён гніласць і тысячы рознастайных балячак, але капіталізм параджае і новую сілу, сапраўды магутную і здаровую, за якою будучае—пролетарыят. Такі вывад з мастацкіх вобразаў, створаных Франко ў гэтых вялікіх творах.

У цытыраваным ужо рэфераце Міхайла Кацюбінскага пра творчасць Івана Франко, пісьменнік раскрывае жахлівую карціну жыцця працоўных, якая паўстае з твораў Франко: «У цэлым радзе апавяданняў—«Барыслаў», «Боа-канстрыктар», «Яць Заліпуга», «Палуйка», «Аўчар» і іншыя, Франко,—піша Кацюбінскі,—малюе нам страшныя карціны жыцця рабочых, карціны, якія нагадваюць часам Дантава пекла. Асабліва цікавы яго «Барыслаўскія апавяданні». Барыслаў—гэта сяло ў Галіцыі, дзе здабываюць нафту і земляны воск. Там, пад зямлёю, у шахтах, у глыбокіх ямах, у духаце і смуродзе, ад якіх кружыцца галава, працуюць у цемрадзі тысячы рабочых; льюць пот, стогнуць і гінуць. Увесь Барыслаў—адна смярдзючая яма. Там цяжкая праца, малы заработак; бруд, п'янства, распуста, дрэнныя харчы і дрэнная гарэлка, усякія хваробы; там чалавек горшы за жывёлу, там брат на брата падымае нож, там чад і вечнае пекла. А з усяго гэтага плывуць залатыя рэчкі і спадаюць у кішэні тых, хто сам не робіць,—усякім драпежнікам, эксплаататарам».

Супроць гэтага Дантавага пекла, супроць прыніжэння і гнёту чалавека, супроць усяго панскага ладу выступае вялікі пісьменнік—дэмакрат.

У сваёй паэзіі Іван Франко таксама разгортвае карціны гаротнага жыцця народа пад панскім ярмом, славіць волю і выказвае надзею, што народ пераможа ворага.

Цяжка жыве селянін пад панскім ярмом. Паэт аплаквае яго долю:

Щоб жити, він життя, і волю власну, й силу
За хліба кусник продає,
Хоч не кормить той хліб, і стать його похилу
Не випрямить, і сил не додає.
Сумує німо він, з тужливим співом оре
Те поле, оре не собі.

Паэт абураны тым, што народ «для добра чужого... кривавий піт лле», «що потом труду свого панам поновання дає», а сам жыве наймітам, недаядае, недасыпае, ходзіць голы і босы, за шчасце маючы палатаную світку, якая пакрывае збітыя панскім бізуном плечы.

І далей, у тым-жа цудоўным вершы («Наймит»), вялікі сын народа—Іван Франко агалашае прароцкія словы, поўныя надзеі і веры ў магутныя сілы народа, які парве ўсе ланцугі, узняўшыся на барацьбу з панамі:

Ори, ори, ти, велетню, закутий
В недолі й тьми ярмо,
Пропаде пітьма й гніт, опадуть в тебе пута
І ярма всі ми порвемо.
Не даром ти в біді, пригноблений врагами,
Про силу духу все співав,
Не даром ти казок чарівними устами
Його побіду величав.
Він побідить, порве шкарлупу пересуду,
І вольний, власный лан,
Ти знов оратимеш—властивець свого труду
І в власнім краю сам свій пан.

Народ-асілак, народ-тварэц, народ моцны духам, хаця і прыгнечаны ворагамі, польскай шляхтай,—не загіне ў ярме, ніколі не стане рабом—такое велічнае гучанне гэтых мужных радкоў.

У вершы «Ірыць Турчын» паэт гаворыць: вучыся валодаць зброяй і трапна страляць, бо скора народ паўстане, цвёрда стане «хлоп в хлопа і плече в плече» і тады прыйдзецца «на ворага стріляти», што «ссе кров із людськості грудей», страляць і перамагчы, каб засвяціўся «новий день».

Іван Франко бачыў у сваёй паэзіі той дзень, калі:

Розвалилась зла руїна,
Покатилася лавина—
І де в світі тая сила,
Щоб вгасила, мов огень,
Розвидняющийся день.

«Розвидняющийся день» настаў для народа Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з прыходам вызваліцельніцы Чырвонай Арміі. Назаўсёды скінута панскае ярмо. І, сапраўды, няма на свеце такой сілы, каб загасіла сонца шчасця і волі, якое ўзышло над Заходняй Беларуссю і Заходняй Украінай—бацькаўшчынай Івана Франко.

А. ТРЫПОЛЬСКІ.

А. УШАКОЎ

З „ЛІТОЎСКАГА ДЗЁННІКА“

Мы ўвайшлі у ціхі край Літоўскі,
У невядомы, у іншашы свет.
І ўсюды нас страчалі па-сяброўску,
І слалі шчыры ад душы прывет.

Ішлі мы праз лясы і з цёплай ласкай
Шумелі векавечныя лясы.
Ішлі лугамі — расцвіталі краскі,
У палях жыты хілілі каласы.

Выходзілі сяляне на дарогу,
І твары хмурыя чарней зямлі,
Прачуўшы, што ідзем на дапамогу,
Усмешкай шчаснаю ва ўсіх цвілі.

У гарадах паўсюды вокны насцеж,
У кожным — промні радасных вачэй.
Глядзелі з цеплынёй на нашы часці
І зрокі загараліся ярчэй.

Узмах вітальны рук. Ускрыкі
«Вале!»*)
Над вуліцай запружанай плылі.
І мы тады пра сонца заспявалі,
Якое ярка свеціць у Крэмлі.

І песня паплыла высокай хваляй,
І гэту песню падхапіў народ.
Дык значыць нас даўно ўжо тут
чакалі,
Наш рыхтаваліся сустрэць прыход.

Употайку вучылі песні нашы,
Сабраўшыся у цесны круг сяброў...
Не дарма мы прайшлі паходным
маршам
Прынёсшы ў гэты край сваю любоў.
Каб прывіды крывавых, жорсткіх
войнаў
Літоўскі край трывожыць не маглі,
Каб людзі працавітыя спакойна
Пад сонцам дружбы сталінскай жылі.

Літва, чэрвень 1940 г.

*) «Ура!».

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

ПЕСНІ МАРАКОЎ

Можа быць, з табой ніколі
Мы не бачыліся, дружа;
За табой —
зямля магнолій,
Вінаграднікаў і ружаў.

А за мною — дзесьці бераг
Патануў пад сіняй сцюжай,
Нада мною ранню шэрай
У самоце чайка кружа.

Толькі разам
і навекі
Палюбілі мы з табой
Мачты, трапы,
небяспекі,
Мора грознага прыбой.

Мо смуткуеш ля штурвала
Па дзяўчыне смуглатварай,
Што з табой калісь спявала
Пад зялёнаю чынарай?

А ў мяне
ў Маскве, на Прэсні,
З галавою русай мара.
Пастаім-жа
мы за песні,
За жанок сваіх, таварыш!

За любоў іх маладую,
Што не знае берагоў.
Хай сыноў для нас гадуюць, —
Для радзімы-ж —
маракоў.

Я глядзеў-бы дні і ночы,
Як на дне зялёнаватым
Зззяюць ярка перлаў вочы,
Як растуць караляў хаты,

Як змяняе мора колер...
Мы-ж падцягваем бушлаты.
Не пакінем мы ніколі
Свет,
рамантыкай багаты.
Сочыць вораг з-за туманаў.
Хай запомніцца
усім:

З нашых рэк і акіянаў
Мы ні кроплі не дадзім!
1940 г.

ТАЛЕНАВІТАЯ МОЛАДЗЬ

Ужо дваццаць пяць дзён пры Саюзе совецкіх пісьменнікаў працуюць курсы-канферэнцыя маладых аўтараў.

З розных абласцей, раёнаў, гарадоў і вёсак Совецкай Беларусі з'ехалася таленавітая літаратурная моладзь у Мінск, каб падзяліцца вопытам сваёй работы, параіцца з лепшымі беларускімі пісьменнікамі, праслухаць рад лекцый па тэорыі літаратуры.

Курсы-канферэнцыі Саюзам пісьменнікаў праводзіліся і ў мінулым годзе. Але характэрнай асаблівасцю курсаў гэтага года з'яўляецца больш глыбокая падрыхтоўчая работа, больш сталы падбор аўтараў.

На курсы былі выкліка괜 маладыя пісьменнікі, якія ўжо друкаваліся ў перыядычным друку, а некаторыя з іх маюць свае кніжкі.

Упершыню на курсы-канферэнцыю прыехалі маладыя пісьменнікі заходніх абласцей — паэты Ан. Іверс, Мікола Засім, Ганна Новік, І. Гуцько, польскі пісьменнік Ю. Равіч, яўрэйскія пісьменнікі М. Бурштэйн і П. Бінецкі.

Сярод маладых беларускіх пісьменнікаў — тт. Чарнышэвіч, Рунец, Зомерфельд, Коўчур, Самцоў, Пранузa, Габееў, Барташэвіч, Сурначоў.

Групу рускіх маладых пісьменнікаў складаюць т.т. Селіверстаў, Кавалёў, Дзенісенка, Шыпнеўская, Багушэвіч, Русееў. Займаецца на курсах яўрэйскі паэт Баруховіч.

За час работы курсаў маладыя пісьменнікі праслухалі рад лекцый: аб старажытнай беларускай літаратуры, беларускай літаратуры XIX стагоддзя, класіках рускай і заходне-еўрапейскай літаратуры, аб творчасці і літаратурных поглядах М. Горкага і В. Маякоўскага, тэорыі верша, асноўных элементах мастацкага твору. Курсанты азнаёміліся з творчасцю буйнейшых сучасных рускіх і беларускіх совецкіх пісьменнікаў.

З вялікай увагай курсанты праслухалі цыкл лекцый: Маркс — Энгельс — Ленін — Сталін аб літаратуры.

Лекцыі чыталі: прафесар Дабрынін, беларускія крытыкі Г. Бярозкін, Ю. Дворкіна Я. Шарахоўскі, навуковыя работнікі І. Гутараў, Р. Скліна, М. Ларчанка.

Старэйшыя беларускія пісьменнікі падзяліліся вопытам сваёй творчай работы. Кузьма Чорны расказаў маладым пісьменнікам, як ён працуе над раманамі, Міхась Лынькоў перадаў вопыт сваёй работы над навеламі і апавяданнямі, Кандрат Крапіва азнаёміў курсантаў з сваёй творчай работай над п'есамі «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім», П. Глебка і М. Клімковіч расказалі аб сваёй творчасці і прачыталі цікавыя лекцыі маладым пісьменнікам. Філіп Пестрак у сваёй гутарцы з курсантамі падрабязна спыніўся на выключна цяжкіх умовах сваёй творчай дзейнасці ў былой панскай Польшчы.

Курсанты прагледзелі рад спектакляў у пастаноўцы Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра імя Горкага — «Крэмлёўскія куранты», «Мяшчане», «Дачнікі», «Слуга двух паноў», «Шклянка вады», «Наследнікі Рабурдэна», «Цар Папап», а таксама спектаклі Віцебскага драматычнага тэатра — «Лес», «Над Бярозаю-ракой». Некаторыя з гэтых пастановак пасля калектыўнага прагляду абмяркоўваліся на канферэнцыях.

Усебаковае абмеркаванне твораў маладых аўтараў, якое зараз праводзіцца на курсах, красамоўна сведчыць, што і за параўнаўча кароткі час работы курсаў маладыя пісьменнікі атрымалі шмат карыснага для сваёй далейшай творчай работы. І, перш за ўсё яны сталі больш патрабавальнымі да саміх сябе, больш крытычнымі да сваёй уласнай творчасці.

Алесь СТАХОВІЧ.

Творчасць маладых пісьменнікаў

Д. Ковалев

ЛАПТИ

У меня за печкой, на гвозде,
есть наследство — ношеные лапти:
завещал мне их покойный дед,
тихо умирая на полатях...

Помню, прислонясь спиной к пеньку,
дед их плел, устало в землю глядя;
куцую суровую пеньку
крепко он закручивал и гладил.

Как берег свое изделье дед!
Лапти брал лишь в церковь из-за
печи.
Но итти на тот, решил он, свет
и скромнее в лыковых и легче.

Бахромой на лаптях пыль висит.
И пеньки давно поблекла зелень...

И сейчас ко мне пришли просить
лапти для колхозного музея.

Я отдать их, было, не хотел.
Я сказал: — Дареное не дарят.
Но осталась, видимо, лаптей
на селе единственная пара.

Если этой пары не отдать,
если тлеть она за печкой будет —
значит, обувь дедову тогда
не увидят будущие люди.

Не увидят... как спиной к пеньку
дед сидел, на лапоть скорбно глядя
и свою суровую пеньку
пальцами морщинистыми гладил.

Анатоль Іверс

ВЯСЕННІ ПАРЫЎ

Зялёным пажарам блакітную шыр
вясна падпаліла ў палях Беларусі,
а вецер за плотам вішняк церушыў
і біцца мацней нехта сэрца прымусіў.

І, глянуўшы ў даль — паляцеў-бы туды,
дзе зніклі апошнія дні ў небасхіле,
дзе нікне схвалёваны воблачны дым,
ды што-ж, — мы не можам падняць
свае крыллі.

У жыцці мала бачылі светлых хвілін,
яно зацямняецца чорным туманам.
А глянь на сады —
зацвілі,
зацвілі,
а моладасць нашая... ўсё яшчэ ў ранах...

Мазольныя рукі не знаюць пары:
у полі — з сярпом, на дарозе —
з лапатай...

Гэй, варта спачыць!
А вясенні парыў
панёс мае думкі далёка за хаты:
дзе вецер за плотам вішняк церушыў,
вясна дзе паліла ў палях Беларусі
зялёным пажарам блакітную шыр,
дзе з крыкам у небе кружыліся гусі...
І я-б там хацеў усёй душой адпачыць,
але нам не можна пакінуць змаганне,
бо выклююць вочы тады крумкачы
і мы не ўбачым цвітучага рання.

Слонім, 1938.

Ганна Новік

Таварышам

Не рабіце дакору, што чорны пражытак
З-пад пяра выплывае балючай струёй;
Што малюецца, чорнай тугой апавітай,
Маладосці туманнае ранне маё.

Мае рукі яшчэ свежа помняць кайданы,
Дрот Картузкі, і краты, і вільгаць муроў.

Мая моладасць змучана, стоптана панам,
Па этапных дарогах распырскана кроў...

Як падымем сцягі мы чырвона-жывымі—
Задрыжыць капітал, што свет кроўю
заліў.
Во тады зазвіняць мае вольныя рытмы
Разам з песняй братоў і радзімы-зямлі.
1939.



Курсы-канферэнцыя маладых пісьменнікаў пры ССП БССР. Курсанты—маладыя пісьменнікі заходніх абласцей БССР (злева направа): таварышы **Ш. Бурштэйн** (гор. Беласток), **М. Засім** (гор. Пружаны), **А. Іверс** (гор. Слонім), **Ю. Равіч** (гор. Беласток), **Г. Новік** (м. Куранец, Вілейскай вобласці), **П. Бінецкі** (г. Беласток).
Фота І. Капілінскага.

Павел Пранузa

КАРАСІ

Пасуцца коні за ракой на лузе,
Ад капытоў варонкі на расе.
У явары трашчыць спрасоння бусел,
Зрабіўшы стойку на адной назе.

Я на крыніцы. Бурбалкі шарамі
Са дна ўзлятаюць, плаваюць,
дрыжаць.
Падняў кулёк. Як меддзю, карасямі
Набіт да крылля рэдкавокі жак.

Іх высыпаю ў човен. Лапухамі
Ад сонца прыкрываю пашчыльней.
Бекас таропка ўзмахвае крыламі
Над галавой — здаецца, дзеўбане.

А карасі чачотку выбіваюць:
Зялёны панцыр цяжкіх лапухоў,
Спрабуюць скінуць, выпырхнуць
жадаюць
У вольны мір травы, вады глухой...

Пад'ехаў к берагу. Бяруць ваду
жанчыны.
У рэчцы соннай ліпеньская сінь.
Яны жартуюць: — Рыбы прадасі нам,
Сусед, а то-ж за год не паясі.

САНЕТ

Дно ракі—шматкроп'е серабра:
Патануў блакіт нябёс глыбока.
Я рукой, закасанай па локаць,
Для каханай хочу зор набраць.
Вось, нагнуўся—і рукаў абмок,
За адну ўхапіўся—расплылася..
Кружыць месяц маладым бекасам
У светлым пер'і промняў над кармой.
У явары туман бялёсацелы
Пагусцеў, хістаецца нясмела,
Бы імкнецца ўпотай узляцець
На вільготным, мяккаватым крыллі.
Лёг зары адбітак на вадзе,
І яснее сінь на небасхіле.

ЖУРАВЕЛЬ

Слізгае хмарка па абмокшай
З вясёлым водблескам траве, —
Шырока крыллі распасцёршы,
Ляціць, як планер, журавель
І замірае на імгненне:
Садзіцца плаўна на вадзе...
Вясёлкавага апярэння
Узлятае цяжкі селязень.

Н. Сурначоў

**

Пра цябе не сніў і не гадаў,
Сваё сэрца праз цябе не мучыў,
А сустрэўся і ў палон папаў,
Хоць жыццём к няволі не прывучан.

Мне здалося, што такіх, як ты
Сонца не страчала і не грэла, —
Пра такіх на скрыпках залатых,
На баянах баяла капела.

Скажуць, гэта выдумка мая,
Можа так—не думаю пярэчыць,
Я-ж таксама не супроць праяў
Слабасці, да кроплі, чалавечай.

Пра цябе адзіную маю
Раскажу я ўсё барвовым зорам.
Гай захоча — гаю прапяю,
Бор папросіць — не адмоўлю бору.

Цішыня. Замёр маёвы шум,
Шум вясны і гаманлівых сёлаў.
Смешна неяк — год цябе нашу
У самым сэрцы без твайго дазволу.

ТЭАТРАЛЬНЫЯ ПІСЬМЫ

Дзяржаўны Яўрэйскі драматычны тэатр БССР, Смаленскі абласны тэатр драмы,—гастролі ў Беластоку.

Сустрэча Дзяржаўнага Яўрэйскага драматычнага тэатра БССР з беластоцкім гледачом—культурная падзея для заходніх абласцей БССР далёка не абыдзённая.

Яўрэйскі тэатр БССР паказаў у Беластоку сем сваіх пастановак: п'есы паэта-ордэнаносца Галкіна «Суламіф» (па Гольдфадэну) і «Бар-Кохба», п'есу «бацькі яўрэйскага тэатра» Гольдфадэна «Два Куніле́млех» у апрацоўцы А. Платнера і Е. Вінагура, музыкальную камедыю М. Гершэнзона «Гершэле Острапольер», інсцэніраваныя творы Шолам-Алэйхема «Тэўе-малочнік» (інсцэніроўка А. Олендэра) і «Сендэр Бланк» (інсцэніроўка Эйбельмана), нарэшце—«Мой сын» Гергеля і Літоўскага.

Гэты рэпертуар паказвае цягаценне Яўрэйскага тэатра БССР, з аднаго боку, да рамантыкі ў адлюстраванні барацьбы народа ў мінулым, з другога боку— да народна-сатырычнага жанру. Нажаль, рэпертуар тэатра не паказаў сучаснасці — росту новага чалавека, фарміравання новай рэчаіснасці ў быту, у свядомасці, ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Лепшым сярод паказаных нам Яўрэйскім тэатрам БССР спектакляў трэба лічыць «Бар-Кохбу» Галкіна

Малады актор М. Ш. Бярозкін у галоўнай ролі стварыў мастацка праўдзівы вобраз народнага героя.

Закончаным, па-майстэрску ўвасобленым вобразам з'яўляецца Манасес у выкананні засл. артыста БССР М. Б. Сокала. Актор не кідае адразу густых чорных мазкоў. У яго Манасеса ёсць нават некаторы арыстакратызм. Але ён—чарвяк, агідны здраднік, паклоннік залатога цельца і залатога рымскага арла.

Артыстка Фрыдман у ролі Пніны поўная абаяння і пяшчотнасці ў сваіх пачуццях да каханага Бар-Кохбы, да сяброўкі Бруры, да чужаземнай рабыні Загір, яна ўмее праяўляць і мужную бясстрашнасць і пякучую нянавісць, калі справа тычыцца барацьбы супроць ворагаў радзімы. Гэта цэласны і пераканальны вобраз.

Узор акторскага майстэрства ў сваёй не вельмі вялікай ролі старога Узіеля дае засл. артыст БССР А. Е. Трэпель.

Глядач Беластока ўбачыў у Яўрэйскім тэатры БССР творчы ансамбль з цікавымі артыстычнымі індывідуальнасцямі.

**

Смаленскі абласны тэатр драмы прайшоў тыповы для совецкага тэатра шлях развіцця. Заснаваны ў 1919 годзе Смаленскі тэатр з'яўляецца прамым дзецішчам рэволюцыі.

Зараз тэатру 20 год. І гастрольная паездка яго ў гэтым годзе —справаздачная.

Тэатр мае склаўшыйся творчы калектыў з таленавітымі акторамі, як Пакроўскі, засл. артыст РСФСР Волгін, Ліберoўская, Нельскі, Міхайлаў, Іванова, Чэрнік, Марціні, Гофман, з маладым здольным рэжысёрам Асеевым і мастаком Медоўшчыкавым.

Створан багаты рэпертуарны фонд, з якога тэатр прывёз у Беласток восем спектакляў: «Гора ад ума» А. С. Грыбаедава, «Мачыха», Онорэ дэ Бальзака, «Без віны вінаватыя» А. Н. Астроўскага, «Іваноў» А. П. Чэхава, «Мяцель» Л. Леонава, «Сады цвітуць» В. Масса і П. Кулічэнкі..

Самай яркай п'есай у рэпертуары тэатра, бясспрэчна, з'яўляецца неўміручая камедыя Грыбаедава, жамчужына рускай драматургіі.

Вялікае ўражанне пакідае створаны артыстам Пакроўскім (ён-жа пастаноўшчык спектакля) вобраз Чацкага. У гэтай ролі Пакроўскі паказаў сябе акторам вялікай сцэнічнай культуры, акторам з вытрымкай, дасканала валодаючым цяжкім майстэрствам паузы.

Каларытную фігуру прадстаўляе сабою Фамусаў у выкананні артыста Марціні. Але цяжка прымірыцца з тым, што перапыняемая, невыразная мова, свайго роду тэатральная астма, можа быць прыёмам сцэнічнай выразнасці. Даэчы, у тэатры некалькі пагаржаюць культурай сцэнічнай мовы, у чым можна папракнуць, за некаторымі выключэннямі, нават вядучых актораў.

Не выйшаў Малчалін у артыста Экслера, вобраз атрымаўся слаба абрысаваным, толькі вельмі далёка нагадваючым стаўшы назоўным імем грыбаедаўскі тып.

Паспяхова справіліся з сваімі ролямі артысты: Ліхачоў — у ролі Рэпецілава, Сахарова — Соф'я Паўлаўна, Ліберoўская — Хлестова, Сокалаў — Горыч, Прастакоў — Загарэцкі. Смятрын у ролі Скалазуба мае ўдалыя моманты, але ўвогуле ў яго інтэрпрэтацыі фігура гэта стала вельмі вадэвільнай, нарачыта утрыраванай.

Другі ўзор класікі, на гэты раз заходнееўрапейскай, дадзен Смаленскім тэатрам у драме Бальзака «Мачыха».

Аўтар «чалавечай камедыі» не пашкадаваў і ў гэтай сваёй п'есе фарбаў для паказу агіднасці, хлусліваспі і парочнасці буржуазнага свету. Але канфлікт у гэтай драме паглыблен і тым, што пад ціхай ды лагоднасцю абывальскага існавання бушуюць і клакочуць буры страсцей—сапраўдных, моцных, сакрушальных.

Камедыя В. Масса і Н. Кулічэнкі «Сады цвітуць» — гэта вопыт стварэння совецкага вадэвіля з музыкай і спевамі. Трэба прызнаць, што гэта досыць незацейлівая «камедыя памылак», але ў пастаноўцы Смаленскага тэатра яна набыла цікавыя фарбы радасці працы і кахання новага совецкага чалавека.

«Мяцель» Л. Леонава, як вядома, адзін з навейшых твораў совецкай драматургіі. Гэта п'еса аб фарміраванні свядомасці чалавека соцыялістычнай эпохі. Яна знайшла ў Смаленскім тэатры цікавую сцэнічную інтэрпрэтацыю.

**

Зараз у Беластоку пачаў гастролі нядаўна заснаваны Дзяржаўны Польскі драматычны тэатр БССР. У рэпертуары тэатра «Каварства і любоў» Шылера, «Пігмаліон» Бернарда Шоу, «Пажыццёвае» класіка польскай драматургіі Ал. Фрэдро і «Мараль пані Дульскай» Габрыэлі Запольскай.

С. ДРЭЗЕР.

Беласток.

С. НІСНЕВІЧ

НЕКАЛЬКІ ЗАЎВАГ АБ АПРАЦОЎЦЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕСНІ

Народная песня — гэта задушэўнейшая мова народа, самы чулы і тонкі сродак перадачы ім сваіх перажыванняў. У песні, як у люстры, адлюстроўваюцца быт і гісторыя, радасці і пакуты, мыслі і мары народа, а каштоўнейшай мастацкай уласцівасцю народнага песеннага вобраза з'яўляецца рэалістычная праўдзівасць і сіла абагульнення. Нездарма гаварыў вялікі Горкі, што «...песні заўсёды кароткія, а розуму і пачуццяў укладзена ў іх на цэлыя кнігі».

Невычарпальна натхненне беларускага народа, невычарпальны багацці беларускай народнай песні — цудоўнай, як квітучыя яблыні беларускіх садоў, цудоўнай, як каласы жыта і кветкі васілька беларускіх палёў, цудоўнай, як пахучая хвоя беларускіх лясоў. Беларуская песня шматгранна па сваіх сюжэтах, як само жыццё, яна лірычна і задушэўна па сваёй мелодыі, яна заўсёды праўдзіва і ўзвышана ў сваёй прастаце.

У сучасны момант няма ні аднаго беларускага кампазітара, які ў сваёй творчасці не прыбягаў-бы да фальклору. Формы выкарыстання фальклору вельмі розныя — ад прасцейшай апрацоўкі да буйных оперных і сімфанічных твораў, наскрозь прасякнутых духам беларускай народнай музыкі.

Кампазітар Н. І. Аладаў адзін з лепшых знаўцаў беларускага фальклору — з'яўляецца і адным з лепшых яго апрацоўшчыкаў. У яго апрацоўцы «Бадай пану ў двары страшна» (для голаса з фортэп'яна) шматкуплетнасць пераадольваецца вар'іраваным суправаджэннем фортэп'яна. Варыяцыйнасць акругляецца своеасаблівай 3-частковасцю, пры якой першы і апошні куплеты маюць аднолькавае суправаджэнне. Прынцып апрацоўкі звязан са зместам — нарастанне да прадапошняга куплета рэалізуецца шляхам агульнага дынамічнага развіцця фортэп'яннай фактуры. У гарманізацыі кампазітар уводзіць храматызмы, захоўваючы натуральны лад

чанька» (для 4-галосага хора без суправаджэння) цяснейшая сувязь са зместам самой песні, асабліва гэта прыкметна ў другім куплеце, дзе галасы ўступаюць паступова ў сувязь са словамі: «адзін каза» — уступае адзін голас, «другі каза» — уступае другі голас і г. д.

У гэтай апрацоўцы кампазітар таксама ўводзіць прынцып вар'іравання, робіць метро-рытмічныя ўшчапэнні, уводзіць падгалоскі, сходныя з агульным складам песні, змяняе паслядоўнасць ва ўступленні галасоў. Разам з тым кампазітар беражліва адносіцца да самой песні і захоўвае яе ладавыя асаблівасці.

Песня «Нету цвету пякнейшага» (для 4-галосага хора без суправаджэння) мае імітацыйны ўступ галасоў, якія ў цэлым ствараюць контрапунктычную тканіну. Нягледзячы на тое, што апошняя не ўласціва беларускім хорам, кампазітар нічым не парушыў характар самой песні—ён захаваў яе ладавыя асаблівасці, перадаў дынамічнае нарастанне, выцякаючае са зместу песні.

Кампазітар В. А. Залатароў валодае вялікім вопытам апрацовак народных песень самых рознастайных народнасцей, якія насяляюць Совецкі Саюз. З'яўляючыся непасрэдным вучнем вялікіх рускіх кампазітараў, стваральнікаў геніяльных апрацовак народных песень — Балакірэва і Рымскага-Корсакава, ён вельмі ўдала спалучае ў сваіх апрацоўках своеасаблівасць нацыянальнай музыкальнай мовы беларускай народнай песні з найвялікшымі дасягненнямі сусветнага музыкальнага мастацтва. «Пяць кантрастаў» Залатарова (для голаса з аркестрам) вылучаецца як адна з лепшых апрацовак беларускіх кампазітараў—аркестравае суправаджэнне дае з незвычайным майстэрствам каларыт песні, гарманічная мова сакавітая і багатая.

Кампазітар А. Е. Туранкоў часта ў сваіх апрацоўках для хора выкарыстоўвае інструментальны прыём — мелодыя з акампаніментам. Асабліва гэта прыкметна ў

дзе два галасы ў тэрцыю спяваюць мелодыю, а астатнія тры галасы як-бы іграюць ролю акордавага суправаджэння, што яшчэ больш падкрэсліваецца гарманічна шырокім размяшчэннем галасоў. Тэмбравая афарбоўка песні блізкая да народнай. (Той-жа інструментальны прыём нагдядаецца і ў апрацоўцы не менш папулярнай песні «Янка»). Гармоніі апрацоўкі простыя.

Кампазітар Е. К. Цікоцкі прытрымліваецца прынцыпу вар'іравання харавой інструментоўкі — супроцьстаўлення рэгістраў. У апрацоўцы песні «Па гарохаўю, па ячанню» (для 6-галосага хора без суправаджэння) склад хора—грамафонна-гарманічны і побач з простымі гармоніямі стварае і складаныя спалучэнні паміж галасамі—напрыклад, паралельныя трохгуччы. Кампазітар змяняе нават і ладавую аснову песні. Тэмбравая афарбоўка песні светлая. Нягледзячы на наяўнасць варыяцыйнасці, насычэння да сярэдзіны песні—у ёй неперамагаецца куплетнасць.

У апрацоўках народных песень кампазітара А. В. Багатырова фактура фортэп'яннага суправаджэння адрозніваецца самастойнасцю і складанасцю, гармоніі храматычныя. У песнях «Ой палын мой, палыночак» і «Што-жа ты, саловушка» (для голаса з фортэп'яна) кампазітар вар'іруе суправаджэнне, дапускае метро-рытмічныя змены, у рэзультаце чаго атрымліваецца дынамічнае развіццё. Аднак, куплетнасць не адхіляецца. У песні «Ой палын» не захоўваецца ладавая аснова—песня выкладзена ў натуральным мінору, а суправаджэнне даецца ў пераменным ладзе з мажорнай дамінантай.

Кампазітар П. П. Падкавыраў шырока выкарыстоўвае прыём ладава-танальнага развіцця песні і ўводзіць красачныя храматычныя гармоніі. У песні «Як дожджык пойдзе» (для голаса з фортэп'яна) кампазітар перамагае аднастайнасць транспаніроўкай другога куплета ў лад мінорнай дамінанты (робячы адпаведную мадуляцыю ў канцы першага куплета). Гэтыя суадносіны танальнасцей натуральна сустракаюцца ў саміх беларускіх народных песнях (напрыклад, у песні «Працi жаркага сонца»). Сінтэз гэтых двух танальнасцей мы сустракаем у заключэнні апрацоўкі—даюцца тонікі абодвух танальнасцей, на якіх пабудаваны абодва куплеты песні. Гэта апрацоўка, прадстаўляючая вялікую цікавасць з

пункту погляду майстэрства, разам з тым неяк не радніцца з характарам самой песні і застаецца ёй чужой. У песні «Я табун сперагу» (для голаса з фортэп'яна) кампазітар выкарыстоўвае напеўкі мелодыі песні, надаючы суправаджэнню элементы выяўленчасці—пастушы наігрыш.

Кампазітар І. Любан захоўвае ўласцівую беларускім народным песням статычнасць фактуры і ладу, шырока выкарыстоўвае вар'іраванне харавой інструментоўкі. Кампазітар не развівае песню, а пашырае яе. У песні «Ой, зарадзіла сільна-буйна» (для 4-галосага хора без суправаджэння) мелодыя песні перадаецца розным галасам, а выкладанне імітацыйнае. У трэцім куплеце, дзе назіраецца вялікае ажыўленне, мелодыя песні праходзіць стрэтна ва ўсіх галасах, а ў басу нават паменшана. У песні «Кацілася ды ясная зорачка» (для 4-галосага хора) кампазітар шырока выкарыстоўвае элементы імітацыі, а ў басу нават праходзяць галасы стрэтна. У песнях «Ой у лузе, лузе» і «Ты чырвоная каліна» (для 4-галосага хора) кампазітар імітацыйнымі прыёмамі не карыстаецца, куплетнасць не перамагаецца. Ладавая аснова песень вытрыманая, але самі песні гарманізаваны элементарнымі акордамі натуральнага мінора, аж да натуральнага дамінант-септакорда перад кадансам, што гучыць вельмі наіўна.

Кампазітар В. А. Ефімаў імкнецца да дакладнай стылізацыі народнай песні—да захавання ладавых асаблівасцей песень, да пошукаў гармоній, адпаведных мелодыі, да захавання каларыту песні. Адсюль у песні «Пара, маці, жыта жаці» і супастаўленне пераменнага ладу з дорыйскім, і рух галасоў паралельнымі квінтамі і тэрцыямі.

Кампазітар Н. Н. Чуркін вельмі часта не лічыцца з ладавымі асаблівасцямі песні. Так, напрыклад, песню «Ты, каліна-маліна» (для 6-галосага хора ў суправаджэнні фортэп'яна) кампазітар апрацоўвае ў соль мажоры, нягледзячы на тое, што яна выкладзена ў міксалідыйскім ладзе. У песні «А ў бару сасна калыхалася» кампазітар карыстаецца метадам вар'іравання куплетаў, а не развіцця самой песні, прычым шырока прымяняецца осцінатны бас (як адзін з прыёмаў паліфоніі, які спалучаецца з варыяцыйнасцю. Бадай, гэты прыём кампазітар выкарыстоўвае часта). Цікава пабудаван другі куплет песні, які з'яўляецца адлюстраваннем усіх элементаў першага куплета, але з выкладаннем у паралельным ладзе (соль мінору супроцьстаўляецца сі бемоль мажоры). Аднак, і тут зноў кампазітар уводзіць інтанацыі, чуждыя песні.

У кампазітара С. Палонскага апрацоўкі народных песень не з'яўляюцца стылізацыямі і мала цікавы як свабодныя апрацоўкі з-за абыдзённасці гарманічнай мовы. Песня «Што й пад сосная» (для голаса з фортэп'яна), нягледзячы на нарастаючы драматызм сюжэта, даецца ў куплетнай форме. Фон песні — статычнае калыханне калыскі— улаўлівае толькі агульны яе настрой, але не раскрывае яе ўнутранага зместу. Гарманічная фігурацыя,—галоўным чынам, на тоніка-субдамінантавых гармоніях, паказваючая калыханне,—мала цікавая.

Кампазітар Н. Сакалоўскі ў сваіх апрацоўках захоўвае куплетнасць і імкнецца да стылізацыі пад народнасць, аднак часта разам з тым недаацэньвае ладавую аснову самой песні. Так, напрыклад, у песні «Ці не быстрая рэчанька», выкладзенай у міксалідыйскім ладзе (соль мажор без фадыез), кампазітар выкладае другі голас у соль мажоры.

Выкладанне хораў строга гамафонна-гарманічнае і апрацоўка заключаецца ў падпяванні сям-там квінты ці тэрцыі, ці агульна прынятых гармоній пад нязменным кантус фірмусам мелодыі. Апрацоўкі кампазітара Сакалоўскага носяць сугуба этнаграфічны характар.

Гэты беглы аналіз апрацовак беларускіх народных песень амаль поўнасцю рабіўся на матэрыяле песень, змешчаных у зборніку «Беларускія народныя і рэволюцыйныя песні для харавога і сольнага выканання», а таму выбар апрацовак з'ўляецца не выпадковым. Якім з разгледжаных апрацовак аддаць перавагу? Пытанне яснае,—тым, у якіх вернасць і сіла песеннага вобраза спалучаецца з яркім мелодычным і гарманічным развіццём.

Задачамі кампазітара пры апрацоўцы народнай песні, у прыватнасці беларускай, з'яўляюцца тыя-ж задачы, якія ставілі перад сабою перадавыя рускія кампазітары, якія імкнуліся даць новую мастацкую якасць, каб народная песня аказалася ўзбагачанай і ўзнятай на больш высокую ступень.

ТЭАТР ВЯЛІКАЙ КУЛЬТУРЫ

Закончыў гастролі ў Мінску Ленінградскі Вялікі драматычны тэатр імя М. Горкага. Ён заваяваў гарачую любоў гледача беларускай сталіцы таленавітымі спектаклямі, якім уласціва высокая ідэйнасць, пафас, яркая мастацкая форма, сваім выдатным акторскім ансамблем.

У 1919 годзе, суровым годзе грамадзянскай вайны, узнялася заслона Вялікага драматычнага тэатра, створанага дзякуючы ініцыятыве і вялікім клопатам аб мастацтве А. М. Горкага, пры ўдзеле паэта А. А. Блока. Тэатр атрымаў ад Аляксея Максімавіча наказ — быць тэатрам «дзе-б барацьба моцных страсцей, гераічныя ўчынкі служылі школай і прыкладам для будаўнікоў новага жыцця». Гэта ўказанне А. М. Горкага вызначыла творчы кірунак тэатра, яго цягаценне да лепшых узораў класікі, да рамантычнай героікі выдатных твораў савецкай драматургіі. Шмат зрабіў тэатр і ў справе ўзбагачэння свайго рэпертуара творамі вялікага майстра рускай драматургіі, чыё імя ён з гонарам носіць. П'есы А. М. Горкага — «Мяшчане» і «Дачнікі» — пастаўлены тэатрам і занялі пачэснае месца ў яго рэпертуары. Створана два дасканалых горкаўскіх спектаклі, якія з асаблівай цікавасцю былі прыняты нашым гледачом.

Горкаўскай страсцю і сілай прасякнуты спектаклі «Мяшчане» і «Дачнікі». Выразнасць, дасканаласць сцэнічнага ўвасаблення кожнага горкаўскага вобраза, любоў да яркага і важкага горкаўскага слова, прастата і агульная высокая культура выканання характэрны для гэтых работ тэатра.

Гэтыя спектаклі — першы (і надзвычай удалы) этап сцэнічнага ўзнаўлення класічнай горкаўскай драматургіі. Наперадзе — далейшая напружаная і ўдзячная работа калектыва тэатра імя Горкага над пастаноўкай усяго цыклу драматургічных твораў А. М. Горкага. Трэба спадзявацца, што пры наступнай сустрэчы тэатр парадуе нашага гледача новымі цудоўнымі горкаўскімі спектаклямі.

Вялікі драматычны тэатр паказаў і апошнія свае работы — дзве п'есы савецкіх драматургаў — «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна і «Цар Патап» А. Капкова.

Спектаклем «Крэмлёўскія куранты» тэатр імя Горкага плённа працягвае пачэсную работу па распрацоўцы ў нашым тэатральным мастацтве вобраза вялікага Леніна. Засл. арт. РСФСР Е. Г. Альтусам, выканаўцам ролі Леніна, калектывам тэатра ў цэлым, праробленa значная работа па сцэнічнаму ўзнаўленню вобраза Леніна, паказу гераічных спраў савецкага народа, створан цікавы спектакль.

Новага таленавітага драматурга адкрыў тэатр спектаклем «Цар Патап» А. Капкова. Гэты спектакль разгортвае перад гледачом страшныя малюнкі мінулага — часоў капіталістычнага рабства, трапна раскрывае звярыную сутнасць уласніка-кулака, яго драпежніцкага «царства». Пастаўлен і сыгран «Цар Патап» з уздымам і добрым мастацкім густам.

У гастрольным рэпертуары Вялікага драматычнага тэатра імя Горкага была прадстаўлена і заходняя класіка. Тэатр паказаў мінскаму гледачу жыццёрадасную, вясёлую камедыю Скрыба «Шклянка вады», бессмяротную камедыю Гальдоні «Слуга двух паноў», досыць рэдка трапляючую на сцэны нашых тэатраў камедыю Заля «Наследнікі Рабурдэна» і з сучаснай заходне-еўрапейскай драматургіі — п'есу Прыстлі «Карнеліус».

Асноўнае багацце Вялікага драматычнага тэатра імя Горкага — актары. Тэатр



Засл. дзеяч мастацтваў ордэнаносец **В. Я. Сафронаў** у ролі Перчыхіна («Мяшчане»). Зарысоўка Е. Гаробчанка.

парадаваў высокімі ўзорамі акторскага майстэрства, філіграннай адшліфоўкай вобразаў, багаццем сцэнічных фарбаў, наліччам сапраўднай тэатральнасці ў спектаклях.

Надоўга астаюцца ў памяці гледача вобразы, створаныя ў спектаклях тэатра імя Горкага засл. дзеячом маст. В. Я. Сафронавым (інжынер Забелін — «Крэмлёўскія куранты», Суслаў — «Дачнікі», Перчыхін — «Мяшчане»), засл. арт. О. Г. Казіко (Маша — «Крэмлёўскія куранты». Суслава—«Дачнікі»), засл. арт. В. П. Паліцэймака (Ніл—«Мяшчане». Патап Урлоў — «Цар Патап»).

Бліскуча выступіла ў горкаўскіх спектаклях (Варвара Басава — «Дачнікі», Поля — «Мяшчане»), паказаўшы вялікае майстэрства і глыбокае пранікненне ў сутнасць вобраза засл. арт. В. Т. Кібардзіна, вядомая па натхнёнаму выкананню ролі Наташы ў кінотрылогіі аб Максіме. Засл. артыстка Е. М. Граноўская, артысты В. А. Меняйлаў, Г. І. Самойлаў, А. Н. Ардзі і многія іншыя заслужана заваявалі гарачыя сімпатыі мінскага гледача.

Тэатр імя Горкага — тэатр яркіх акторскіх дараванняў, тэатр вялікай культуры. Сустрэча з ім — таленавітым прадстаўніком братняга рускага тэатральнага мастацтва — радасная падзея ў культурным жыцці сталіцы Савецкай Беларусі

Ю. РУДЗЬКО.

ХОД КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ

Усесаюзны конкурс на лепшую п'есу, які праводзіцца ў гэтым годзе, ставіць сваёй асноўнай мэтай узняцце ідэйна-мастацкай якасці савецкай драматургіі і паляпшэнне рэпертуару тэатраў, вылучэнне новых таленавітых аўтараў і стварэнне п'ес, адлюстроўваючых барацьбу за пабудову комуністычнага грамадства ў СССР.

Конкурс праводзіцца ў два туры: першы тур праходзіць па саюзных рэспубліках і заканчваецца 1 верасня гэтага года. Ён побач з агульнымі задачамі мае і свае асаблівыя — узбагаціць і ўмацаваць нацыянальную драматургію, выявіць новых таленавітых драматургаў.

На першы тур конкурса па нашай рэспубліцы паступіла ўжо дваццаць п'ес.

Тэматыка дасланых драматычных твораў досыць разнастайная. Ёсць сярод іх п'есы аб заможным калгасным жыцці, аб Чырвонай Арміі. Большасць-жа твораў прысвечана вызваленню Заходняй Беларусі ад іга польскіх паноў. Атрыманы п'есы на беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай мовах.

Горш з разнастайнасцю жанраў. Прысланыя п'есы—пераважна драмы. Адсутнічаюць трагедыі, камедыі, вадэвілі.

Зараз аргкамітэт конкурса, створаны Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР, праводзіць папярэдняе рэцэнзіраванне прысланых твораў. П'есы, якія маюць пэўную ідэйную і мастацкую вартасць, накіроўваюцца членам журы.

Упраўленнем па справах мастацтваў зацверджан склад журы, створаны з віднейшых прадстаўнікоў літаратуры, крытыкі, тэатральнага мастацтва. Сярод іх народны паэт-ордэнаносец Янка Купала, пісьменнік-ордэнаносец Міхась Лынькоў, засл. артыст рэспублікі ордэнаносец В. Галаўчынер, народны артыст рэспублікі—ордэнаносец В. Уладамірскі і інш.

Трэба адзначыць, што невялікая колькасць паступіўшых на конкурс твораў сведчыць аб недастатковай масавай, арганізацыйнай рабоце, якая праводзіцца аргкамітэтам па папулярызацыі конкурса і заахвочванню аўтараў да ўдзелу ў ім.

Аргкамітэтам не было праведзена дастатковай работы з пісьменнікамі, у прыватнасці з маладымі пісьменнікамі і драматургамі.

В. ЗУБ.

Драматычныя гурткі рыхтуюцца да агляду

Тэатральнае мастацтва—адзін з самых папулярных і любімых відаў багатай мастацкай самадзейнасці.

Усесаюзны агляд тэатральнай самадзейнасці, які хутка будзе праведзен, выявіць усё лепшае, што накапілася ў гэтым жанры.

106 драматычных гурткоў налічваецца ў Мінскай вобласці. Да ліку лепшых, творча вырасшых, павінен быць аднесен драматычны гурток клуба імя Горкага Новабарысаўскай запалкавай фабрыкі.

Пачалі сваю работу гурткоўцы з пастаноўкі аднаактовак, затым перайшлі да вялікіх і сур'ёзных твораў. Зараз у актыве драмгуртка п'есы «Прафесар Мамлок», «Платон Крэчэт». Гэтыя пастаноўкі з'явіліся для гурткоўцаў добрай школай.

У аглядзе тэатральнай самадзейнасці барысаўскі гурток удзельнічае п'есай Астроўскага «Беднасць не загана». Гурток доўга рыхтаваўся да гэтай пастаноўкі. Чыталі Астроўскага, аб Астроўскім. Кіраўнік гуртка тав. П. А. Сярэбранікаў, суміруючы багаты матэрыял, рысаваў перад гурткоўцамі вобразы мінулага. І гурткоўцы змаглі гэтыя вобразы цікава, жыва ўзнавіць на сцэне.

У гуртку—рабочыя, інжынеры, стаханаўцы, служачыя фабрыкі. Адкуль, здавалася-б, ведаць ім усе тонкасці таго жыцця, аб якім напісана п'еса. Тут сказалася доўгая, упартая, удумлівая і сур'ёзная творчая работа, умелая рэжысура, любоў да Астроўскага. І інжынер Камароў у цяжкой ролі «шырокай натуры» — Любіма Тарцова, і начальнік ПВХО Вярцінскі ў ролі купца Фамы Гардзеіча, і стаханаўка Сяліцкая, якая іграе Анну Іванаўну,—усе яны цікавыя, своеасаблівыя, усе ўносяць індывідуальныя рысы ў выконваемую ролю, імкнуцца стварыць яркі вобраз.

Даўно вядомы свайму гледачу і гурток чэрвеньскага Дома соцкультуры. Кіруе гуртком педагог тав. Гарбузоў. Ім пастаўлены п'есы беларускіх драматургаў, і ў гэтым яго бясспрэчная заслуга. Гурток паставіў «Партызаны» Крапівы, да агляду рыхтуе «Хто смяецца апошнім».

Мінскія металісты рыхтуюць к агляду украінскую оперу «Запарожац за Дунаем», будаўнікі (гурток працуе на яўрэйскай мове)—«Гершэле Острапалер».

У драмгуртках вялікае творчае ажыўленне. Але зноў, як гэта ўжо стала за апошні час «хранічным» з'явішчам — нехапае рэпертуару. Мала п'ес—добрых, цікавых, даступных для драмгурткоў.

Е. САДОЎСКІ.



«Слуга двух паноў» у пастаноўцы Ленінградскага Вялікага тэатра імя Горкага. Труфальдзіно — арт. **Г. І. Самойлаў** Смеральдзіна — арт. **А. М. Даудз.**

Фото І. Каплінскага.

ТЭАТР НА РАЁНЕ

Мы атрымліваем заданне: абслужыць калгасы Лідскага раёна.

...Ад Ліды да вёскі Ганчары — 18 кілометраў. Едзем на аўтамабілі. Праз паўгадзіны на месцы. Тут ужо чакаюць нас, клапатлівыя гледачы загадзя падрыхтавалі сцэну.

На школьным двары імправізіраваны «тэатр». Невялікі памост са старых дошчак ловка прымайстраван да ганку, школьныя парты акуратна пастаўлены ў рады — усё гэта пры адсутнасці клубнага памяшкання з'явілася нядрэнным месцам для паказу. Сцэна без куліс, вядома, пад адкрытым небам. А неба сёння, як па заказу, светлаблакітнае, чыстае, акурат такое, якое неабходна нам для афармлення спектакля.

Яшчэ зусім светла, сонца толькі збіраецца заходзіць, а гледачы ўжо займаюць месцы. Першыя рады... Тут сядзяць жанчыны з груднымі дзецьмі. Далей — сівабародыя дзяды і бабулі. Яшчэ далей — моладзь. Дзеці прымайстраваліся ў мяккіх «ложах» — пад кустамі, на зялёнай траве.

К пачатку спектакля сабралася каля тысячы чалавек. Тут прысутнічаюць сем'і — ад прадзеда да праўнука. Дома ніхто не жадаў заставацца. Ды і не дзіва. У вёску Ганчары прыехаў тэатр! Гэтага ніколі не было і не магло быць пры панскай уладзе.

Калі пачаўся другі акт, я выйшаў на вуліцу. На дарозе слуп пылу. Нехта галопам імчыцца на кані. Пад'язджае да школы.

— Даўно пачалося, таварыш?

— Так.

— Ай, ай... От, бяда...

І сівабароды коннік лае сябе за тое, што спазніўся на спектакль.

Задаволеныя разыходзіліся, раз'язджаліся гледачы. Спектакль глядзелі калгаснікі трох калгасаў: імя Сталіна, імя Леніна і імя 17 верасня.

Я падыходжу да пажылай жанчыны, цікаўлюся яе ўражаннем:

— Усё зразумелі?

— Ну, як-жа... Гэта-ж вы на нашай, на роднай мове прадстаўлялі... Усё добра, усё, даражэнькія... Дзякуем... Пойдзем, дзеткі, малачком пачастую...

***

Былы маёнтак «Вялікі альхавец», цяпер калгас імя Сталіна. Нас першым сустракае малады хлапец год дваццаці.

— Хто вы, таварышы?

— Артысты.

— А што гэта такое — артысты?

Растлумачылі, дагаварыліся. Выбіраем у садзе месца, дзе-б можна было абсталяваць сцэну. Вось некалькі вялікіх ліп. Тут было-б нядрэнна і нам, і гледачу. Але нельга: па суседству пасека. Пчолы могуць перашкодзіць. Небяспечна.

Знаходзім чатыры яблыні, якія нібы па заказу выраслі спецыяльна для нашага прыезду. Вешаем на іх заднік, сукны, заслону. Памоста няма — дэкарацыі прыходзіцца ўкапваць у зямлю.

Ужо зусім цёмна. Адзіная крыніца святла — ліхтар «Лятучая мыш». Чапляем яго на галінку дрэва.

— Трэці сігнал! — абвяшчае памочнік рэжысёра акторам. — Усё ў парадку! Заслона...

Скончылі спектакль у тры гадзіны ночы. Старшыня калгаса ад імя ўсіх прысутных выносіць падзяку акторам.

— Дзякуем, таварышы... Прыязджайце да нас... Хутка клуб пабудуем... Электрычнасць будзе!..

***

Мястэчка Радунь — раённы цэнтр. Іграем спектаклі ў былой краме мястэчковага гандляра. Цесна і нам, і гледачу.

Але побач, на плошчы, вырастае вялікі каменны будынак. Гэта — будучы Дом сацыялістычнай культуры. Тут будзе абсталяваная, прасторная сцэна, фае, вялікая зала.

Барыс САВІЧ.

Баранавіцкі абласны драматычны тэатр.

ГАСТРОЛЬНАЯ ПАЕЗДКА Ў ЗАХОДНІЯ ВОБЛАСЦІ

28 ліпеня спектаклем «Ноч у верасні» Тэатр юнага гледача закончыў свае гастролі ў Гродне.

Сумненні тэатра, ці будзе новым гледачам зразумелы спектакль аб зараджэнні стаханаўскага руху, рассеяліся пасля першай-жа карціны. Гледачы Гродна з вялікім хваляваннем сачылі за падзеямі ў п'есе,—ім—новым стаханаўцам, ударнікам табачнай фабрыкі, велазавода, фанернага камбіната—спадабаўся спектакль, у якім яны бачылі блізкіх ім герояў.

У часе гастролей у Гродне тэатр паказаў 18 спектакляў, абслужыўшы 10 тысяч гледачоў горада.

Юныя і дарослыя гледачы савецкага Гродна цёпла ўспрымалі спектаклі тэатра. Асаблівым поспехам карысталіся пастаноўкі «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Як гартавалася сталь» Н. Астроўскага і «Снежная каралева» Е. Шварца. Акторы тэатра выязджалі з канцэртнай праграмай і ў піонерскія лагеры, дзіцячыя дамы.

Зараз калектыў тэатра працуе над новым спектаклем—«Казка» М. Светлова. Гэта адзін з лепшых твораў, напісаных для юнага гледача. Цікавая літаратурная форма п'есы «Казка», яе гумар, лірыка, яркія паэтычныя вобразы даюць удзячны матэрыял для творчай работы тэатра. «Казка» перакладзена на беларускую мову Р. Лыньковым. Спектакль ставіць мастацкі кіраўнік тэатра рэжысёр М. М. Сухараў, мастак — А. З. Брыклін.

Адначасова тэатр рыхтуецца да пастаноўкі п'есы драматурга М. Таубе «На парозе жыцця». П'еса Таубе раскажа нашаму гледачу аб жыцці савецкай школы, аб марах нашых вучняў—палкіх патрыётаў сацыялістычнай радзімы. Аўтар разам з тэатрам дапрацоўвае п'есу, улічваючы заўвагі, якія былі зроблены калектывам тэатра.

Новую сваю п'есу аб дзецях Заходняй Беларусі абяцае перадаць тэатру пісьменнік Кузьма Чорны.

Апрача гэтага ў партфелі тэатра — п'есы «Праз дваццаць год» Светлова, «Большэвік» Дэля, якія даюць магчымасць калектыву стварыць высокамастацкія спектаклі.

Тэатр і надалей будзе замацоўваць свае творчыя сувязі з пісьменнікамі, бо толькі сапраўдная сувязь тэатра з пісьменнікам дапаможа нашаму маладому калектыву вызначыць свой творчы профіль.

У гэтым-жа годзе тэатр мяркуе паказаць гледачу п'есу славутага рускага драматурга А. Н. Астроўскага «Даходнае месца», у пастаноўцы народнага артыста БССР Е. А. Міровіча, і паставіць камедыю Мальера «Плутні Скапена». Работа над гэтымі спектаклямі адыграе вялікую ролю ў выхаванні і далейшым росце калектыва тэатра.

Гастролі тэатра па заходніх абласцях Савецкай Беларусі, дзе тэатр упершыню сустракаецца са сваімі новымі гледачамі,—пачэсная і ганаровая справа для нашага калектыва.

Вл. СТЭЛЬМАХ.

Пісьменнікі Беластока

М. БУРШТЫН

Сярод пісьменнікаў Беластока, якія эмігрыравалі з б. Польшчы, віднае месца займае яўрэйскі празаік М. Бурштын.

М. Бурштын дэбюціраваў у 1931 годзе кнігай «На развалінах Плойны», у якой ён адлюстраваў паднявольнае становішча яўрэйскага мястэчка ў перыяд так-званай «грабшчызны» (Грабскі — польскі міністр у 1924—25 гг., які пакінуў нядобрую славу падатковымі прыцясненнямі яўрэйскага насельніцтва).

У 1935 годзе М. Бурштын апублікаваў раман «Лёс», у якім даецца вобраз чалавека, раней не сустракаемы ў яўрэйскай літаратуры б. Польшчы,—вобраз прадстаўніка асімiліраваўшайся яўрэйскай плутакратыі, вернага саюзніка нянавіснай польскай шляхты. «Лёс» М. Бурштына паказвае жыццё яўрэйскіх народных мас у перыяд імперыялістычнай вайны 1914 года. У рамане заўважаецца значная культура аўтара, які добра разбіраецца ў падзеях мінуўшай эпохі.

Аднак, побач са станоўчымі якасцямі рамана ў ім ёсць і рад істотных нелахопаў ідэйнага і мастацкага парадку. Так, напрыклад, недастаткова акрэслены станоўчыя вобразы рамана, у радзе месц кнігі таленавіты пісьменнік злоўжывае эратычным элементам, што ілюстрыруе натуралістычную тэндэнцыю ў яго творчасці.

У 1937 годзе выйшла трэцяя кніга М. Бурштына «Ля рэк Мазовіі». У ёй пісьменнік зноў звяртаецца да глыбока-засвоенага ім тэматычнага матэрыялу яўрэйскага мястэчка напярэдадні распаду б. польскай дзяржавы. У сваім рамане М. Бурштын паказаў такія рысы жыцця і быту б. Польшчы, якія ў вышэйшай ступені пераканаўча характарызуюць працэс загнівання і распаду польскай капіталістычна-памешчыцкай дзяржаўнасці. Яскравейшай адзнакай гэтага загнівання з'явіўся легалізаваны люты антысемітызм, які з дазволу польскіх уладароў нястрымна бушаваў па ўсёй краіне. У кнізе М. Бурштына можна знайсці нямала старонак, якія апісваюць разгул антысемітызму ў б. Польшчы.

З вялікай мастацкай сілай паказвае ў сваім рамане М. Бурштын прадстаўнікоў дэмакратычных працоўных колаў яўрэйскага народа. Вось мястэчковы рабочы Герш Лустык, увасабленне невычэрпнай веры народа ў перамогу справядлівасці, дабра, свабоды. Вяртаючыся з могільніка пасля пахавання ахвяр яўрэйскага пагрому, Герш звяртаецца да ідучага побач яўрэя: «Я вам гавару, што горад нанава будзе пабудаваны, я вас запэўняю...»

Раман «Ля рэк Мазовіі» з'явіўся значным крокам наперад у мастацкім развіцці М. Бурштына. Зараз раман выдаецца савецкім выдавецтвам «Эмес» (Масква) і ў рускім перакладзе — Дзяржлітвыдатам СССР.

Чацвёртая кніга М. Бурштына—«Хлеб-соль» выйшла ў пачатку 1939 года. У ёй М. Бурштын выступае як вопытны навеліст, дасканала валодаючы складаным майстэрствам кароткага апавядання.

Зараз М. Бурштын працуе над двума новымі творамі. У адным з іх у якасці асноўнага вобраза будзе фігураваць Герш Лустык—герой рамана «Ля рэк Мазовіі». Гэта перакочванне героя з кнігі ў кнігу як-бы сімвалізіруе бесперапыннасць і ўстойлівасць дэмакратычных тэндэнцый яўрэйскага народа, песняром якіх і з'яўляецца даравіты пісьменнік.

Д. РЫХТЭР.



У чырвоным кутку калгаса імя Сталіна (Дзісненскі раён, Вілейскай вобласці).

Фотахроніка БЕЛТА.

ЮГАН СЕБАСЬЦЯН БАХ

Да 190-годдзя з дня смерці

«Не ручай! — Мора павінна было быць яму імя!» (Бах — па-нямецку — ручай), — у захапленні ўсклікнуў аднойчы Бетховен, пазнаёміўшыся ў канцы свайго жыцця з творчасцю вялікага кампазітара. Сапраўды: невычэрпнае багацце філасофскага зместу, агульначалавечых ідэй, здаровых, мажорных і светлых пачуццяў, манументальнасць, шырачэзны дыяпазон музычных формаў—якасці неўміручых твораў І. С. Баха. Невычэрпная разнастайнасць мелодыкі, рытмікі, багацце гарманічных спалучэнняў зліваюцца ў Баха ў адно магутнае цэлае, здзіўляючае сваёй велічнасцю слухача.

Мінуўшыя стагоддзі не зменшылі значэння Баха, ніколькі не паралізавалі вялікай сілы непасрэднага ўздзеяння яго аркестравых, арганных, клавесінных твораў.

Геніяльны кампазітар, якога называлі «Ньютонам музыкі», па-праву можа быць назван таксама бацькам еўрапейскай музыкі. Усё наступнае пасля Баха развіццё музычнай творчасці нясе на сабе адбітак уплыву мастацкага генія Баха, прадаўжае, развівае яго дасягненні.

Чым тлумачыцца неўвядаемасць музычнай творчасці Баха? Што жывіла яго творчасць, што рабіла і робіць яго творы блізкімі, хвалюючымі? Гэта робяць найвялікшы гуманізм зместу спадчыны Баха, народнасць ідэй і меласу, што жывілі Баха як мастака.

Перыяд, на які прыпадае творчасць Баха,—першая палова XVIII стагоддзя, перыяд застою і змроку ў нямецкай рэчаіснасці. У пісьме да Штархенбурга Энгельс пісаў, што гэта былі «смяротная стомленасць і бяссілле нямецкіх мяшчан, што выцякала з эканамічна жалкага становішча Германіі ў перыяд з 1648 да 1830 года, якое выразілася спачатку ў ханжастве, затым у сантыментальнасці і прасмыканні перад князямі і дваранствам»...

Гэта была абстаноўка, давіўшая ўсё жывое і прагрэсіўнае. Але яна хавала ў сабе і тыя ідэі, якія пазней раскрыліся з такой магутнасцю ў творчасці Лессінга, Гётэ, Шылера.

Іоган Себасьцян Бах адчуў на сабе ўвесь гнёт тых прыёмаў упраўлення, з дапамогай якіх эксплаатыраваўся народ на карысць групы тыранаў-курфюрстаў. Вялікі кампазітар усё жыццё правёў у зневажанні свайго генія. Спачатку ён быў на службе ў дробных князёў у Веймары, Кецку, якія лічылі, што неабходна мець сярод прыдворнай чэлядзі і музыкантаў, каб не адставаць ад Версаля і пышных Людовікаў. Пазней 27 год свайго жыцця ў Лейпцыгу Бах правёў у барацьбе «з дзіўным і варожым да музыкі начальствам».

Бах—сын не свайго стагоддзя. Ён перарос яго. Ён прадстаўнік у музыцы перадавой гуманістычнай мыслі, выразіцель самых здаровых, самых светлых, мажорных пачуццяў чалавека. Яго творчасць насычана напружанай барацьбой супроць коснасці, вузкасці, мяшчанства, яго акружаўшага, за святло супроць змроку. Але гэта не азначае, што яго музыка толькі эпічная. Ён таксама буйнейшы ў гісторыі музыкі лірык. Яго пранікнёныя, натхнёныя элегічныя прэлюдзіі і фугі ёсць неперасягнёныя шэдэўры самай глыбокай, самай паэтычнай музычнай лірычнай мовы. Лірыка яго разліта і ў велізарных манументальных опусах вакальна-сімфанічнага жанру («Страсці», «Высокая месса»), і ў строгіх, велічных формах чыста інструментальных твораў («брандэнбургскія канцэрты», сюіты, санаты і г. д.), і ў драматызіраваным жанры музычна-лірычных паэм, і ў яго славутых кантатах. Бах быў найвялікшым музыкантам-паэтам. Рысы мастацкага рэалізма, канкрэтнасць музычнага вобраза спалучаюцца ў яго з вялікім узлётам фантазіі, сілай перажыванняў і размахам мыслі.

Творчасць Баха стаіць на рубяжы двух эпох. З аднаго боку, вялікі кампазітар падвёў выдатны вынік тэматычнага развіцця музычнай творчасці да эпохі класіцызма ў Германіі. У яго творчасці былі сабраны, адабраны і адлюстраваны ў сінтэтычна абагуленым выглядзе тэматычныя шуканні эпохі—вынік упартай падрыхтоўчай работы трох стагоддзяў, якую Бах закончыў. З другога боку, па свайму ідэйнаму і мелодычнаму зместу, па ноўшаствах у развіцці музычных форм і выяўленчасці ў галіне інструментарыя і выканаўчай арганнай тэхнікі—ён пракладваў новыя шляхі, чым пераклікаўся з XIX стагоддзем.

Асноўнымі крыніцамі музычнай мовы Баха, мелодыкі і тонікі яго твораў былі народная песенна-танцавальная творчасць (не толькі германская, але і раманская, асабліва французская песня і інструменталізм) і лютэраўскі харал, які карміліся таксама ў свецкай песеннай тэматыцы.

Выкарыстанне Бахам харала давала повад буржуазным даследчыкам звязваць мастацтва найвялікшага гуманіста з царкоўнай культурай сярэдневякоўя. Гэта была ілжывая ўстаноўка. «Рэлігійны маскарад» гэта толькі эпохіяльная форма, праз якую раскрываліся ідэі і пачуцці паза рэлігійнага складу. Бах—арганіст, служыцель царквы, які пісаў для царквы, у музычных формах не мог быць у баку ад царкоўнага аблачэння. Але гэта было толькі аблачэнне, якое хавала пад сабою здаровы пачатак. Гаворачы аб выкарыстанні Бахам харала, трэба памятаць, што асноўнай і важнейшай крыніцай пратэстанскага харала была свецкая песня.

Бах напісаў вялікую колькасць свецкіх кантат, велізарную колькасць інструментальнай музыкі для самых разнастайных саставаў, сольных інструментаў і аркестра, некалькі свецкіх песень.

Бах «зніжаў» культавую тэматыку да рэальна-адчувальнага, звычайнага, чалавечага. Часам-жа сваімі музычна-выяўленчымі штрыхамі (узяць хаця-б славуты паказ «крыку пеўня» ў «Страсцях па Матвею») Бах уносіў у свае «культавыя» творы рысы оперна-камічнага «ультра»-свецкага жанру. У духоўных творах адчуваецца жыццёвая сіла, багацце фантазіі, вялікая здольнасць раскрываць у гуках псіхалогію мыслячага і адчуваючага чалавека.

У галіне інструментапабудовы Бахам таксама шмат дадзена для будучага. Самога кампазітара далёка не здавальнялі ні «адчувальны» клавікорд, ні сухі, «трэскучы» клавесін. Вядома яго ўпартая вынаходніцкая работа ў справе ўзбагачэння, удасканалення, далейшага развіцця сучаснага яму інструментарыя. Бах не толькі добра валодаў многімі інструментамі, як выканавец, але і добра быў знаёмы з іх тэхналогіяй.

Пры характарыстыцы і самым кароткім аглядзе наватарства Баха нельга не сказаць асобна аб вакальна-сімфанічным стылі кампазітара. Апошні з'явіўся рэзультатам яго творчых імкненняў да сінтэзу, да гарманічнага зліяння музыкі, слова і руху (якое калі і не раскрываецца «сцэнічна», дык амаль заўсёды маецца на ўвазе: невыпадкова некаторыя культавыя кантаты Баха па сутнасці прадстаўляюць танцавальныя сюіты). Адхіляючыся ад тэкста, часам нават ад якой-небудзь тэкставой дэталі ў музыцы, Бах заўсёды падпарадкоўваў слова музыцы. Кампазітар з асаблівай цікавасцю адзначаў у самім літаратурным тэксце музычныя матывы.

Франц Мерынг пісаў, што творчая дзейнасць першых вялікіх носьбітаў буржуазнай асветы, гуманістаў у Германіі XVI — XVIII стагоддзяў «не знаходзіла ў буржуазных класах ні апоры, ні адгалоску». Гэта трэба сказаць і аб творчасці Баха. Геніяльны кампазітар, рэфарматар не быў ацэнен сучаснікамі. Больш таго, ён памёр у найвялікшай беднасці.

Толькі ў XIX стагоддзі Бах быў нанава «адкрыт».

Вялікая культура сацыялізма па заслугах ацаніла творчасць геніяльнага кампазітара. Савецкаму чалавеку блізкі і зразумелы высокія пачуцці чалавечнасці, мажорнасці, лікавання, якія нясуць слухачам творы Баха. У радзе вялікіх гуманістаў мінулага, цанімых і любімых савецкім народам, адно з першых месц належыць Іогану Себасьцяну Баху.

П. НЕАПАЛІТАНСКІ.

ДА ВЕДАМА ЧЫТАЧОЎ

Пачынаючы з гэтага нумара, газета «ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА» будзе выходзіць штотыднёва.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76. Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.

Уп. Галоўлітбела № Т—1553.